ТВОРЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПРА ДАКТАРОЎ 20

УЗЯЦЬ ДЫ АДРЭСТАЎРАВАЦЬ МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 СНЕЖНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 242 (29356)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль МАРКЕВІЧ, міністр культуры (падчас наведвання Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку):

«Мы бачым, наколькі думкі і сама праца злучаюцца і прыносяць вынік. Дзяржава ўважліва ставіцца да гісторыі манастыра, выдаткоўвае сур'ёзныя сродкі, каб усе задумкі ажыццявіліся. Сёння пагутарылі з будаўнікамі, усе работы ў Спаса-Праабражэнскім храме ідуць па графіку. Асцярогі, што рэстаўрацыя зацягнецца і не завершыцца ў 2024 годзе (як запланавана), няма».

КАРАТКА

• **Выстаўка па праекце «Беларусь памятае» адкрылася ў Магілёве. Яна прысвечана Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён».**

• Адзіная гарадская служба занятасці Мінска адкрылася па вуліцы Берасцянскай.

• **Беларускія медыкі падрыхтавалі для калег — урачоў агульнай практыкі, отарыналарынгалогіі, стаматолагаў — практычны дапаможнік па ранняй дыягностыцы пухлін.**

• МАЗ і «Прамагралізінг» прадставілі новую лізінгавую праграму са стаўкай ад 8,5 %.

Сталіца. Перадсвяточнае

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Беражыце сябе

АСЦЯРОЖНАСЦЬ ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Як пазбегнуць зімовых неспадзяванак?

Нарэшце да нашых краёў дабраліся якія-ніякія халады. Але ўвесь набор прыродных з'яў гэтай пары года — адмоўныя тэмпературы, перыядычны снег, мокры снег ці нават дождж, галалёд ды і проста вельмі кароткі светлавы дзень — можа прынесці шмат непрыемных неспадзяванак. А пра тое, як звесці іх шанц да мінімуму, расказалі спецыялісты.

Каля 700 тысяч траўмаў...

Столькі штогод атрымліваюць беларусы. Год ад году лічба змяняецца нязначна — у межах 1 %. Гэтыя звесткі прывёў **урач-траўматолаг-артапед прыёмнага аддзялення РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Андрэй ЯРАШЭВІЧ.**

Сёлета ў краіне ўжо было некалькі дзён з галалёдам, і невядома яшчэ, колькі іх будзе наперадзе. Пакуль што тэмпература паветра ў снежні, за выключэннем апошніх дзён, трымалася пераважна каля нулявой адзнакі. І дробная плітка вокамгненна ператваралася ў суцэльную коўзанку.

— Летась самыя высокія паказчыкі траўматызму па краіне былі па Мінску: каля 970 выпадкаў на 100 тысяч чалавек, — паведаміў Андрэй Ярашэвіч. — Напрыклад, сярод дзяцей ён дзеліцца наступным чынам: каля паловы ўсіх выпадкаў маюць бытавы характар, прыкладна траціна — вулічны. Лічаныя працэнты прыходзяцца на траўмы ў школе, і недзе каля шасці працэнтаў — на заняткі спортам.

СТАР. 4

Памяць

ДЗЕВЯЦЬ ІМЁНАЎ ВЕРНУТЫЯ З НЕБЫЦЦЯ

Пошукавая экспедыцыя «Дняпроўскі рубеж — 2020» стала адной з выніковых за апошнія гады

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгодзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«СУПАКОЙВАЦЦА НЕЛЬГА. НАВАТ КАЛІ Ў НАС ЗА СПІНАЙ ЗНАХОДЗІЦЦА ДРУГАЯ АРМІЯ Ў СВЕЦЕ»

Міністр абароны Віктар Хрэнін і начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Аляксандр Вальфовіч прадставілі Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку прапановы па перапрацоўцы плана прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі.

Фота БелТА.

Кіраўнік краіны нагадаў, што яшчэ раней былі дасягнуты дамоўленасці аб тым, каб актуалізаваць план прымянення сумеснай групоўкі войскаў з улікам сітуацыі на заходніх граніцах і ў свеце наогул. Ён растлумачыў, што дамоўленасцямі аб Саюзнай дзяржаве для абароны граніц на заходнім кірунку прадугледжана сумесная групоўка, аснову якой складаюць Узброеныя Сілы Беларусі. А ў Заходняй ваеннай акрузе Расіі створаны сілы і сродкі, якія ў выпадку канфлікту, ваенных дзеянняў разам выступаюць на абарону Беларусі і Расіі.

«Мы дамаўляліся пра тое, што з улікам сітуацыі на нашых заходніх граніцах і наогул у свеце нам трэба надаць сучаснасць і актуалізаваць матэрыялы, дакументы па прымяненні гэтай групоўкі Узброеных Сіл. Ведаю, што і ў вас, і ў Расійскай Федэрацыі такая работа праведзена. Мяркую, што Прэзідэнту Расіі таксама будзе даложана пра вынікі гэтай работы, — сказаў беларускі лідар. — Сёння я хацеў бы пачуць, што новага ў сувязі з перапрацаванымі дакументамі і што трэба будзе нам яшчэ зрабіць (калі неабходна), таму што нагнятанне абстаноўкі ідзе».

Аляксандр Лукашэнка сцвярджае, што б ні заяўляла кіраўніцтва ЗША і НАТА, апраўдваючыся: яны толькі трэніруюцца, — зразумела, што трэніруюцца з пэўнай мэтай.

«Таму нам супакойвацца нельга. Нават калі ў нас за спінай знаходзіцца сапраўды магутная армія, як кажуць, другая армія ў свеце, вельмі магутная. Але тым не менш нам супакойвацца нельга», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

У тэму

Па словах начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Аляксандра Вальфовіча, аналіз ваенна-палітычнай абстаноўкі сёння сведчыць пра тое, што Злучаныя Штаты Амерыкі ствараюць супярэчнасці. Ваенныя групоўкі, размешчаныя на тэрыторыі сумежных краін, фарміруюцца з узброеных сіл не Літвы і Польшчы, таму немагчыма, па словах Аляксандра Вальфовіча, спакойна глядзець на гэтыя рэчы.

План прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў, прадстаўлены Прэзідэнту, распрацаваны генеральнымі штабамі Беларусі і Расіі з улікам прагнозу ваенна-палітычнай і стратэгічнай абстаноўкі.

«У дадзеным дакуменце рэгіянальная групоўка войскаў перадусім — механізм стратэгічнага стрымлівання і адбіцця буйнамаштабнай агрэсіі супраць Саюзнай дзяржавы. Трэба разумець, што ні ў адну вялікую вайну і вялікую агрэсію ні адна дзяржава ў свеце самастойна не можа справіцца. Таму і распрацаваны план прымянення рэгіянальнай групоўкі», — паведаміў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл.

Прэзідэнт пацікавіўся ў вайскоўцаў складам Узброеных Сіл, узбраеннем, якое мае армія, што ўяўляе сабой сумесная рэгіянальная групоўка войскаў. Па словах Аляксандра Вальфовіча, план кіраўнік краіны ўзгадніў і дакумент будзе вынесены на зацвярджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, якое запланавана на снежань.

План прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў уваходзіць у склад дакументаў плана абароны краіны, які кіраўнік дзяржавы зацвердзіў у мінулым годзе. План прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў карэктаваўся паступова на працягу года з улікам зменлівай ваеннай абстаноўкі. У адноўленым дакуменце ўдакладнены баявы склад рэгіянальнай групоўкі войскаў, яго структура і тэхніка, якая знаходзіцца на ўзбраенні ў арміях Беларусі і Расіі.

«ВЫ ЗАЎСЁДЫ БЫЛІ АСНОВАЙ І ФУНДАМЕНТАМ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

Прэзідэнт узяў удзел ва ўрачыстым сходзе да 100-годдзя БНТУ

Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні на мерапрыемстве адзначыў: удзел у святкаванні юбілею ўніверсітэта ў яго графіку не быў запланаваны. Але растлумачыў, чаму не змог абмінуць падзею. Мерапрыемства ён назваў данінай павагі і падзеяй у гонар тых, хто праславіў сваімі справамі Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт.

«Вы з'явіліся роданачальнікам інжынернай думкі і інжынернай творчасці ў нашай краіне. Вы вельмі добра зрабілі, што выставілі на пад'ездзе найлепшыя прыклады сваёй творчасці. Творчасці тых, хто ў свой час не проста дакрануўся да гэтых сцен нашай ВНУ, а тых, хто, атрымаўшы тут веды і адукацыю, стварае цуды», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, інжынер, прайшоўшы праз вышэйшую адукацыю (не толькі БНТУ), знаходзіцца ў жорсткай сусветнай канкурэнцыі — усе мадэлі тэхнікі, якія прадстаўлены на выстаўцы ва ўніверсітэцкім двары, ствараюцца ў вялікай колькасці ў многіх краінах.

«І тое, што тыя, хто сядзіць тут — ад сівавалосых акадэмікаў да студэнтаў, — выстаялі ў гэтай канкурэнцыі і ствараюць запатрабаваную на сусветным рынку прадукцыю, як у народзе кажуць: дарагога варта», — адзначыў кіраўнік краіны.

Ён падкрэсліў: заўсёды з павагай ставіўся да выпускнікоў БНТУ і цаніў інжынераў.

«Інжынер — гэта сапраўдны чалавек. Як палітык, які чвэрць стагоддзя знаходзіцца ва ўладзе ў Беларусі, я заўсёды параўноўваў паводзіны тых ці іншых студэнтаў, выпускнікоў. Вы заўсёды былі асновай і фундаментам нашай дзяржавы. І прызначаючы на нейкія самыя высокія пасады, калі я бачу, што чалавек інжынер, я заўсёды кажу, што гэты чалавек дзяржаўны», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар акцэнтаваў увагу на тым, што вельмі хоча, каб выпускнікі БНТУ і далей трымалі гонар свайго ВНУ і былі апорай дзяржавы.

«Мы перажываем вельмі складаны перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці, незалежнасці і суверэнітэту. І гэта звязана перадусім са зменай пакаленняў. Тое пакаленне, што заваявала нам свабоду і незалежнасць, — яго, на жаль, амаль няма. Удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны засталося крыху больш за 5000 у нашай дзяржаве. Гэта светлыя, святыя людзі, якім мы заўсёды пакланяліся. Кожны трэці загінуў у гэтай страшнай вайне і там кавалася аснова нашай незалежнасці», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

На яго думку, змена пакаленняў заўсёды праходзіць складана, і ў навуцы ў тым ліку. Ён пажадаў, каб і новае пакаленне выхоўвала патрыётаў, каб, адыходзячы ад актыўнай дзейнасці, старэйшыя былі ўпэўненыя, што суверэнітэт і незалежнасць нашай дзяржавы непарушныя, каб мы больш ніколі не жылі на чужой зямлі і нашы дзеці адчувалі сябе гаспадарамі на гэтай.

«Гэта складаны ўрок, складаная будучыня, якая нас чакае і якая ўжо пачалася. Я звяртаюся да старэйшага пакалення: зрабіце ўсё, каб інжынер заўсёды заставаўся патрыётам і бярог наш суверэнітэт і нашу незалежнасць, пры ўсіх абставінах змог захаваць нашу дзяржаву», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў БНТУ ордэнам Працоўнай Славы. Гэты адметны знак уручаны ўпершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі. Таксама з рук кіраўніка краіны дзяржаўныя ўзнагароды атрымалі супрацоўнікі і выкладчыкі ўніверсітэта.

Пасля цырымоніі ўручэння званняў Прэзідэнт падкрэсліў, што са многімі ўзнагароджанымі ён не толькі сустракаўся ў жыцці, але і знаёмы. Адным з іх быў лаўрэат ордэна Пашаны Армен Сардараў, дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ, аўтар мемарыяльнага знака «Пачатак дарог Беларусі» на Кастрычніцкай плошчы, архітэктурных праектаў мастоў, пуцеправодаў па ўсёй краіне.

«Некаторыя мне нагадвалі, што мы разам зрабілі. Мне запомніўся наш архітэктар. Ён мне кажа: «Вы памятаеце, як мы «нулявы кіламетр» устанаўлівалі?» Канешне, памятаю. На яго цяпер усе глядзяць, але не ўсе ведаюць, што мы з табой гэту добрую справу зрабілі. Я думаю, сёння ўся Беларусь даведаецца, што «бацька» гэтага «нулявога кіламетра» прысутнічае тут, і мы дамовіліся, што гэта не апошняя наша работа. Мы павінны яшчэ нешта добрае зрабіць для нашай краіны, нашай Беларусі», — звярнуўся Прэзідэнт да Армена Сардарава.

Развітваючыся з прысутнымі, кіраўнік краіны заўважыў, што, на жаль, сёння немагчыма праводзіць мерапрыемствы з удзелам вялікай колькасці людзей, але галоўнае ў святкаванні — душэўнасць і цеплыня.

«Дай Бог, каб гэта душэўнасць і цеплыня ніколі не пакідалі вас, вашых родных і блізкіх», — дадаў у завяршэнне Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

Парламенцкі дзённік

СТЫКЕР СУПРАЦЬ РЭКЛАМЫ

Змяненні законаў па пытаннях рэкламы, за якія ўчора прагаласавалі дэпутаты, дазволяць адмовіцца ад рэкламных буклетаў і лістовак, што кідаюць у паштовыя скрыні. Распаўсюджвальнікі рэкламнай прадукцыі абавязаныя будуць прыслухоўвацца да пажаданняў уладальнікаў паштовых скрынь, інакш прыйдзецца мець справу з Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

«Замацоўваецца норма, якая прадугледжвае рэкламадаўцам і распаўсюджвальнікам спыніць дастаўку рэкламы ў паштовыя скрыні па першым патрабаванні іх уладальніка, — расказала журналістам пра адпаведны законапраект **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Аксана ГАЙДУК.** — Заяўніку дастаткова звярнуцца да рэкламадаўцы, кантакты якога ўказаныя на рэкламным матэрыяле. Яшчэ адзін спосаб адмовы — размяшчэнне стыкеру на паштовай скрыні з адпаведнай просьбай. Кантроль за выкананнем гэтай нормы замацаваны за Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю».

Некаторыя нормы накіраваныя на лібералізацыю ў дадзенай сферы. Адмененая адміністрацыйная працэдура па ўзгадненні зместу вонкавай рэкламы і рэкламы на транспартным сродку, дадала Аксана Гайдук. Распаўсюджвальніку рэкламы дадзена права па ўсталяванні сродкаў вонкавай рэкламы без праектнай дакументацыі. Скарочаны аб'ём медыцынскай рэкламы, якой неабходна ўзгадненне з Міністэрствам аховы здароўя.

Вельмі актыўнае абмеркаванне, па словах дэпутата, атрымала пытанне па гукавой рэкламе ў грамадскім транспарце. «Парламентарыі пасля падтрымкі ведамаснага міністэрства прыйшлі да высновы аб забароне такой рэкламы, — расказала яна. — Рэклама на электронным табло ў выглядзе бягучага радка, у выглядзе выявы дазволеная. Забарона гукавога суправаджэння ў грамадскім транспарце датычыцца толькі камерцыйнай рэкламы і не датычыцца сацыяльнай».

Грамадскае абмеркаванне вялося і наконт палажэння адносна рэкламы на транспартных сродках і прычэпах, якія стаяць асобна і не выкарыстоўваюцца для мэтавага прызначэння больш за шэсць месяцаў. Такая рэклама ў праекце закона забараняецца.

Камп'ютарная праграма для аператыўнікаў

Сёлета ўпершыню карэктуецца прыняты пяць гадоў таму Закон «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці». У Авальнай зале парламента адбылося другое чытанне змяненняў.

Сярод асноўных навацый — увядзенне паняцця «камп'ютарная інфармацыя» і наданне суб'ектам аператыўна-вышуковай дзейнасці магчымасці ствараць і выкарыстоўваць сродкі таемнага атрымання і фіксацыі інфармацыі, у тым ліку з дапамогай спецыялізаванага праграмнага забеспячэння, «без чаго надзвычай цяжка эфектыўна супрацьстаяць злачыннай дзейнасці ў сетцы Інтэрнэт», — лічыць **дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Аляксандр МАРКЕВІЧ.**

«У 2019 годзе зарэгістравана больш чым удвая больш злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій у параўнанні з 2018 годам, і гэта тэндэнцыя ўзмацняецца на працягу апошніх гадоў», — адзначыў парламентарый.

Шэраг прапанаваных змяненняў накіраваны на павышэнне эфектыўнасці забеспячэння бяспекі грамадзян, якія аказвалі ці аказваюць садзейнічанне суб'ектам аператыўна-вышуковай дзейнасці, і іх блізкіх, захаванасці іх маёмасці ад злачынных намераў, дадаў Аляксандр Маркевіч і заўважыў, што норма асабліва актуальная ў цяперашні час.

Закон таксама дапаўняецца магчымасцю выкарыстоўваць сведчанні, якія змяшчаюцца ў матэрыялах аператыўна-вышуковай дзейнасці, для прафілактыкі найперш карупцыі, гэта значыць знаходжання прычын такіх правапарушэнняў і ўмоў, якія ім садзейнічаюць, прыняцця мер па іх ліквідацыі і недапушчэнні супрацьпраўных паводзін грамадзян.

«Неадназначную ацэнку атрымалі палажэнні праекта закона, якія вызначаюць магчымасць правядзення аператыўнага эксперыменту па заяве пра дачу хабару ў адносінах да заяўніка і яго блізкіх сваякоў, — расказаў пра этап падрыхтоўкі законапраекта да другога чытання Аляксандр Маркевіч. — Выказваліся прапановы па пашырэнні такой катэгорыі да ўсіх асоб, якія фігуруюць у заяве пра дачу хабару, што не знайшло падтрымкі ў большасці зацікаўленых, а таксама ў Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы. Бо пры пэўных умовах рэалізацыя такой неправераной інфармацыі будзе мець элементы правакацыі і супярэчыць прэзумпцыі невінаватасці».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«Інтэлектуальныя «Дзяражычы»

Новая пагранічная застава модульнага тыпу адкрыта на мяжы з Украінай

Яна размясцілася ў населеным пункце Дзяражычы Лоеўскага раёна і атрымала аднайменную назву.

З пачатку кастрычніка пад кантролем пагранічнага падраздзялення знаходзіцца рачны ўчастак беларуска-ўкраінскай дзяржаўнай граніцы працягласцю больш за 20 кіламетраў.

У цырымоніі адкрыцця заставы ўзялі ўдзел першы намеснік старшыні Дзяржпагранкамітэта генерал-маёр Ігар Буткевіч, Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Шулейка, а таксама вайскоўцы пагрангрупы.

Як адзначылі падчас адкрыцця пагранзаставы супрацоўнікі Дзяржпагранкамітэта, на гэтым участку не сустрэнеш звыклых тэхнічных сродкаў аховы ў выглядзе працяглых сігналізацыйных комплексаў. «Дзяражычы» — гэта частка «інтэлектуальнай граніцы», сучаснае абсталяванне якой дазваляе адсочваць сітуацыю на ўсёй падкантрольнай тэрыторыі дыстанцыйна. Дзякуючы аўтаматызаванаму пасту тэхнічнага назірання ажыццяўляецца кантроль за ахоўваемым участкам

Фота ДПК.

граніцы і прылеглай мясцовасцю ў светлы і цёмны час сутак, пад кругласутачным наглядам застаюцца нават самыя аддаленыя і забалочаныя месцы. Усё гэта забяспечвае аператыўнасць рэагавання на правапарушэнні на дзяржграніцы. Акрамя таго, у сваёй службе пагранічнікі заставы «Дзяражычы» актыўна выкарыстоўваюць плаўсродкі рознага тыпу і цеплавізары.

— Усе памяшканні заставы знаходзяцца ў 23 кампактных шматфункцыянальных модулях, якія аснашчаны ўсім неабходным для камфортнага пражывання і эфектыўнага выканання службовых задач, — адзначылі ў Дзяржпагранкамітэце. — Пост абсталяваны аўтаномнымі крыніцамі электразабеспячэння (сонечнымі панэлямі, ветрагенератарамі, акумулятарамі) і інтэграваны ў інтэлектуальную сістэму аховы граніцы цэнтра маніторынгу, які размешчаны на пагранзаставе «Хойнікі».

У памяшканнях устаноўлены бытавая тэхніка і мэбля. На заставе ўласная лазня і душавыя кабінкі. На тэрыторыі арганізаваныя месцы для захоўвання і рамонту тэхнікі, а таксама вальеры для службовых сабак. Для правядзення заняткаў вайскоўцаў створаны гарадок пагранічнай службы і спартыўныя аб'екты.

— Немалаважным з'яўляецца тое, што ўзвядзенне модульнай заставы патрабуе істотна меншых сіл, сродкаў і часу, а таксама дазваляе, пры неабходнасці, у кароткія тэрміны перамясціць падраздзяленне на іншы ўчастак граніцы, — падкрэслілі ў Дзяржпагранкамітэце. — Такі падыход да пабудовы «інтэлектуальнай граніцы» дазваляе падраздзяленню дзейнічаць у дачыненні да рэальных парушальнікаў заканадаўства, эканоміць матэрыяльныя сродкі, чалавечы рэсурс і значна павялічваць эфектыўнасць аховы рубяжоў, падкрэслівае ДПК.

У перспектыве на беларуска-ўкраінскім участку граніцы плануецца расшырыць колькасць аўтаномных тэхнічных сродкаў аховы, што дазволіць дыстанцыйна кантраляваць звыш ста кіламетраў тэрыторыі, у тым ліку пагранічны ўчастак Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Блізкая ўлада

Спосаб вырашэння праблем

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі **ў суботу, 12 снежня, з 9.00 да 12.00** правядуць:

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Сцяпанавіч КАРАНІК. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васілевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Узнагарода

Прэмія Чынгіза Айтматава прысуджана беларусу

«Бываюць асобныя выпадкі, асобныя лёсы людзей, якія робяцца здабыткам многіх, бо цана таго ўрока настолькі высокая, так шмат змяшчае ў сабе тая гісторыя, што тое, што было перажыта адным чалавекам, як бы распаўсюджваецца на ўсіх, хто жыў ў той час, і нават на тых, хто прыйдзе ўслед, пазней».

Так напісаў вялікі кыргызскі пісьменнік Чынгіз Айтматаў у кнізе «І вякуе дзень даўжэй за век». І гэтыя словы цалкам можна аднесці да яго самога. Напісанае ім дасюль уплывае на нас, дае адказы на важныя пытанні. А ў 2012 годзе па ініцыятыве парламента Кыргызскай Рэспублікі была заснаваная прэмія імя Чынгіза Айтматава для грамадзян дзяржаў СНД. Яна прысуджаецца раз на год за дасягненні ў галіне літаратуры, выдатныя арыгінальныя творы і шматгранную літаратурную дзейнасць.

Калі мне давялося быць у Домемузеі Чынгіза Айтматава ў Кыргызстане, каля Бішкека, заўважаўся не толькі нацыянальны кантэкст, але і мультыкультурная прысутнасць, — экспанаты сведчылі пра сяброўства Айтматава з калегамі з іншых краін, глыбокую пашану да пісьменніка з боку сусветнай супольнасці... А ў шафе, сярод розных выданняў, на пачэсным месцы знаходзілася кніга «Буранны паўстанак» у перакладзе на беларускую мову. У 2018-м, калі святкавалі 90-годдзе кыргызскага класіка, у Беларусі быў праведзены конкурс эсэ «Мой Чынгіз Айтматаў», перакладзены на беларускую мову апошні раман пісьменніка «Калі падаюць горы (Вечная нявеста)».

І вось навіна: сёлета прэмію Чынгіза Айтматава атрымаў вядомы беларускі пісьменнік, літаратуразнавец, доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гніламёдаў. Ён вядомы не толькі як даследчык. Пад яго кіраўніцтвам і пры ягоным удзеле здзейсніліся такія значныя праекты, як «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» ў 4 тамах, 6 кнігах, «Гісторыя беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў» у 2 тамах, «Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI — першая палова XVIII стагоддзя» ў 2 тамах, вялася распрацоўка Збору твораў Якуба Коласа ў 20 тамах, Збору твораў Максіма Танка ў 13 тамах, Збору твораў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў 2 тамах, Збору твораў Івана Шамякіна ў 23 тамах. Ён аўтар 13 манаграфій і больш чым 350 артыкулаў, прысвечаных беларускай літаратуры, а ўсяго мае на рахунку больш за тысячу навуковых прац. Але ў апошні час Уладзімір Васілевіч пачаў пісаць прозу. Раманы «Валошкі на мяжы», «Уліс з Прускі», «Расія», «Вяртанне», «Вайна», «Пасля вайны» — гэта расповед пра лёсы беларусаў з адной вёскі, якіх раскідвае па свеце, але яны ўсё адно прывязаныя да радзімы. Як выказваецца сам пісьменнік, «магчыма, пайшоў гэтым шляхам, бо літаратуразнаўства не давала ўсіх магчымасцяў асэнсаваць свой час, усё XX стагоддзе, сучаснікаў, гістарычныя асобы, змену пакаленняў, якія дае белетрыстыка». Але сумяшчэнне жанраў не выглядае парадаксальна, як заўважыў крытык Алесь Марціновіч: «Гніламёдаў-празаік, пішучы свае раманы, шмат у чым адштурхоўваўся і ад Гніламёдава-даследчыка». У прозе захоўваецца тая грунтоўнасць, абапіранне на факты, што і ў навуковых працах.

Кандыдатуру Уладзіміра Гніламёдава прадставіла да ўзнагароджання Камісія па культуры, інфармацыі, турызме і спорце МПА СНД з фармуліроўкай «за дасягненні ў галіне літаратуразнаўства і шматгранную літаратурную дзейнасць». Сярод лаўрэатаў прэміі Чынгіза Айтматава — казахскі народны паэт, пісьменнік Алжас Сулейменаў, галоўны рэдактар расійскай «Литературной газеты» Юрый Палякоў, дырэктар Інстытута старажытных рукапісаў Матэнадарана імя Месропа Маштоца Грач'я Тамразян, народны пісьменнік Азербайджана, рэжысёр і сцэнарыст Анар Рзаеў. Атрымліваў прэмію рэжысёр Андрэй Канчалоўскі за экранізацыю рамана Айтматава «Першы настаўнік». У мінулым годзе ўзнагарода прысуджана народнаму паэту Таджыкістана, драматургу, кінасцэнарысту Мухамаду Гаібу.

— Я быў знаёмы з Чынгізам Айтматавым. Сустракаўся з ім у Алма-Аце, у Бішкеку, — расказаў Уладзімір Васілевіч «Звяздзе». — У Алма-Аце святкавалі юбілей казахскага асветніка, паэта Абая Кунанбаева, памятаю, што Чынгіз Айтматаў тады меў званне пасла. А ў Бішкек я ездзіў на канферэнцыю па фальклоры. З самага пачатку было зразумела пра Айтматава — надзвычай цікавы чалавек. Запомнілася, як яго вельмі паважалі і ў Кыргызстане, і ў Казахстане, называлі «вялікі светач Усходу». Калі ўспомніць яго творы, там сярод герояў — і казахі, і кіргізы. Я звярнуў увагу, як яны ўзаемадзейнічаюць, спраўджваючы прынцып добрасуседства. Айтматаў як пісьменнік выйшаў на новы светапогляд, пачаў пісаць пра тыя выклікі, якія неба пасылае чалавецтву. Пра тое, што забываюць нацыянальнае, захапляюцца рэчамі, якія разбураюць асобу. Не заўсёды крытыка, асабліва «цэнтральная», у савецкія часы, добразычліва ставілася да Айтматава. Чапляліся да яго евангельскіх матываў — а іх у яго творчасці вельмі шмат. Знаходзілі ў яго дробязныя памылкі... Але вартасць створанага правяраецца часам.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

«Звязда» віншуе Уладзіміра Гніламёдава з узнагародай і жадае яму здароўя і творчага плёну.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ЗША прынялі новую касмічную стратэгію

Касмічная прастора становіцца патэнцыйнай арэнай баявых дзеянняў паміж амерыканцамі і іх сапернікамі, і Вашынгтон павінен быць гатовы ў выпадку неабходнасці «адбіць агрэсію і абараніць нацыянальныя інтарэсы Злучаных Штатаў у космасе». Пра гэта паведамляецца ў новай нацыянальнай касмічнай стратэгіі, прынятай прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам. Мяркуецца, што выкананнем адпаведных задач у першую чаргу зойміцца Касмічныя сілы ЗША, якія былі афіцыйна заснаваны Трампам 20 снежня мінулага года. Яны сталі шостым відам узброеных сіл ЗША і першым, створаным пасля фарміравання іх сучаснай структуры ў 1947-м.

Вялікабрытанія і Канада заключылі пагадненне аб гандлі

Пагадненне захоўвае аб'ём гандлю на ўзроўні 20 мільярдаў фунтаў стэрлінгаў, заявіла міністр знешняга гандлю Вялікабрытаніі Ліз Трас. Паводле яе слоў, гэтая дамоўленасць «адкрывае магчымасць для больш перадавога дакумента», які будзе ахопліваць такія сучасныя сферы, як «лічбавыя тэхналогіі, пашырэнне эканамічных правоў жанчын і праблемы навакольнага асяроддзя». Адзначаецца, што падпісаная дамова ўступіць у сілу 1 студзеня 2021 года. На час пераходнага перыяду перад канчатковым выхадам Вялікабрытаніі з ЕС гандлёвыя адносіны паміж краінамі працягнуць рэалізоўвацца ў адпаведнасці з пагадненнем аб свабодным гандлі паміж ЕС і Канадай. Захаванне ўмоў на цяперашнім узроўні бакі ўзгаднілі ў мінулым месяцы.

СААЗ назвала галоўныя прычыны смяротнасці ў свеце

За апошнія два дзесяцігоддзі людзі сталі часцей паміраць ад неінфекцыйных хвароб, такіх як сардэчна-сасудзістыя захворванні, дыябет і рак. Такія тэндэнцыі адзначаюцца ў маштабным даследаванні аб прычынах смяротнасці ў свеце, якое правяла Сусветная арганізацыя аховы здароўя. СААЗ падкрэслівае, што ранняя дыягностыка і прафілактыка такіх захворванняў могуць значна знізіць колькасць смяротных зыходаў. Калі ў 2000-м у дзясятцы асноўных прычын, па якіх паміралі людзі, было толькі чатыры захворванні, якія не перадаюцца кантактным шляхам, то летась — ужо сем. СААЗ таксама заключае, што ў параўнанні з 2000-м сярэдняя працягласць жыцця ў свеце вырасла на шэсць гадоў: цяпер яна складае больш чым 73 гады супраць 67. Пры гэтым толькі пяць з гэтых «дадатковых» гадоў жыцця людзі праводзяць, застаючыся здаровымі.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю КЕБІЧА Вячаслава Францавіча, вядомага дзяржаўнага дзеяча, былога Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю КЕБІЧА Вячаслава Францавіча, чалавека, чыё імя назаўсёды ўпісана ў гісторыю нашай краіны.

Вячаслаў Францавіч запомніцца сучаснікам як першы прэм'ер-міністр незалежнай Беларусі, член Палаты прадстаўнікоў, чалавек з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй.

Выказваем спачуванні родным і блізкім В. Ф. Кебіча ў сувязі з горам, якое іх напаткала, і падзяляем іх смутак.

КАНТАКТЫ ВЫЗНАЧАЕ ЎРАЧ, ЗАМЕЖНІКАМ ПАТРЭБНЫ ТЭСТ НА COVID-19

Прынятыя новаўвядзенні, звязаныя з распаўсюджваннем каранавіруса

Пры наведванні пацыента з COVID-19 тэрапеўты паліклінік цяпер могуць выпісваць бальнічныя лісты кантактам першага ўзроўню. Гэта норма цяпер замацавана ў пастанове Савета Міністраў № 705 ад 7 снежня 2020 года.

Цяпер факт наяўнасці ў грамадзяніна кантакту і яго ўзровень можа быць установлены маніторынгавай групай паліклінікі падчас наведвання (выезду) па месцы жыхарства ці знаходжання грамадзяніна, які мае інфекцыю COVID-19, растлумачылі ў Міністэрстве аховы здароўя. Раней гэта маглі зрабіць толькі службовыя асобы органаў і ўстаноў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд, дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць кіраванне дзейнасцю ў галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва. Па сутнасці, новаўвядзенне спрашчае і паскарае працэдуру вызначэння кантактаў, што вельмі важна падчас пандэміі.

Нагадаем, што згодна з пастановай Савета Міністраў № 705 ад 7 снежня 2020 года, Беларусь закрывае наземныя пункты пропуску на выезд з краіны ў мэтах прадухілення распаўсюджвання каранавіруса. Яшчэ адно новаўвядзенне — пастанова таксама абавязвае замежных грамадзян, якія дасягнулі шасцігадовага ўзросту (за выключэннем тых, хто мае дазвол на пастаяннае ці часовае пражыванне на тэрыторыі Беларусі), якія прыбываюць у Беларусь, мець арыгінал ці копію медыцынскага дакумента (на папяровым носьбіце ці ў электронным выглядзе), што пацвярджае адмоўны вынік лабараторнага даследавання на інфекцыю COVID-19. Выключэнне складаюць пэўныя катэгорыі замежных грамадзян. Супрацоўнікі органаў пагранічнай службы, а ў пунктах пропуску, дзе пагранічны кантроль ажыццяўляецца мытнымі органамі, службовыя асобы мытных органаў надзяляюцца паўнамоцтвамі ажыццяўляць праверку згаданага медыцынскага дакумента ў замежных грамадзян. Адсутнасць такога медыцынскага дакумента з'яўляецца падставай для адмовы ва ўездзе ў нашу краіну.

Пры гэтым у пастанове гаворыцца, што і замежнікі, і грамадзяне Беларусі, якія прыбылі з аховы здароўя ў пералік краін «чырвонай зоны» (на 10 снежня гэта 146 краін), абавязаныя знаходзіцца ў самаізаляцыі 10 каляндарных дзён з дня прыбыцця. Яны не могуць быць прапушчаны цераз дзяржаўную граніцу да заканчэння тэрміну самаізаляцыі. Каранцін для іх не адменены нават пры наяўнасці адмоўнага ПЛР-тэста.

За суткі ў Беларусі зарэгістраваныя 1939 пацыентаў з COVID-19, выпісаныя — 2135 чалавек, паведамляе Міністэрства аховы здароўя ў сваім тэлеграм-канале. На цяперашні момант гэта самы вялікі сутачны прырост у нашай краіне за час пандэміі.

З пачатку пандэміі ў Беларусі былі зарэгістраваныя 154 392 чалавекі са станоўчым тэстам на COVID-19. Паправі-ліся 132 085 пацыентаў, у якіх раней быў пацверджаны дыягназ COVID-19. У актыўнай фазе COVID-19 — 21 069 чалавек. За ўвесь перыяд распаўсюджвання інфекцыі на тэрыторыі краіны памерлі 1238 пацыентаў з выяўленай каранавіруснай інфекцыяй. Восем — за апошнія суткі. Усяго ў краіне праведзена 3 517 016 тэстаў. За мінулыя суткі выканана 29 548.

Алена КРАВЕЦ.

Надвор'е

Атлантыка нясе цяпло з поўдня Еўропы

А ў суботу будзе марозна на фоне дажджоў

Памарозіла нас некалькі дзён і — хопіць. Яшчэ паспее, а пакуль... Сітуацыя з надвор'ем у нас мяняецца. Пад напорам Атлантыкі марозны антыцыклон паволі адступае да Урала, адкрываючы дарогу атмасферным франтам і больш цёпламу паветру з поўдня Еўропы. Таму ў найбліжэйшыя дні па краіне пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Пры выпадзенні дажджу на халодную паверхню будзе ўтварацца галалёд, на дарогах будзе слізка, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А таму нам з вамі неабходна быць вельмі асцярожнымі на дарогах. Ужо сёння на большай частцы краіны чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, галалёд, на дарогах галалёдзіца. У асобных раёнах будзе згушчацца туман. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні парывісты. Максімальная тэмпература паветра складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

Самае непрыемнае надвор'е будзе ў суботу, калі дождж будзе ісці пры мінусавой тэмпературы. У гэты дзень пад уплывам малаактыўнага атмасфернага фронту месцамі, пераважна па паўднёвым захадзе Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаецца галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе знаходзіцца ў межах 3—10 марозу, удзень — ад аднаго да 6 градусаў ніжэй за нуль. Па паўднёвым захадзе будзе цяплей, дзе на працягу сутак чакаецца ад мінус 2 градусаў да 1 цяпла.

Сапраўдная адліга прыйдзе да нас у нядзелю. У гэты час наша краіна апынецца ва ўладзе чарговага атмасфернага фронту, які рухаецца з боку Украіны. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні, заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 марозу, па паўднёвым захадзе — ад нуля да плюс 1 градуса. Удзень будзе наогул «ніяк» — ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня істотнай змены ва ўмовах надвор'я не чакаецца. У панядзелак на большай частцы краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах магчыма наліпанне мокрага снегу, туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, удзень — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. Адліжнае надвор'е чакаецца да сярэдзіны наступнага тыдня.

Сяргей КУРКАЧ.

АСЦЯРОЖНАСЦЬ ПЕРШ ЗА ЎСЁ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На жаль, траўмы часам становяцца прычынай інваліднасці.

— Паказчык першаснай інваліднасці сярод насельніцтва краіны ва ўзросце ад 18 да 65 гадоў — 2,7 % на 10 тысяч чалавек, — паведаміў спецыяліст. — Пры гэтым трэба адзначыць, што праблемы траўматызму ўвогуле ўяўляюць вялікую цікавасць для шырокага кола спецыялістаў розных галін. І меры, скіраваныя на яго зніжэнне, залежаць ад многіх фактараў. У першую чаргу — ад алкагалізму і ўвогуле спажывання спіртных напояў. Справа ў тым, што ў прыёмны пакой многія людзі з траўмамі паступаюць менавіта ў нецвярозым стане.

Слізкая дарога? Набірайце нумар 125

Як адзначыў **старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела арганізацыі дарожнага руху і дарожнай інспекцыі УДАІ МУС Вадзім ФІЛОНЧЫК,** знізіць аварыйнасць на дарогах праз кепскія ўмовы дапамагаюць своечасовыя папераджальныя захады.

— Штогод супрацоўнікі тэрытарыяльных органаў у кастрычніку—лістападзе праводзяць мэтавае абследаванне вуліц і дарог, каб вывучыць іх стан і спраўнасць вонкавага асвятлення, — адзначыў спецыяліст. — Вывучаецца падрыхтоўка прадпрыемстваў і арганізацый дарожнай і камунальнай гаспадарак да выканання тэхналогій зімовага ўтрымання. Асаблівую ўвагу аддаюць падрыхтоўцы тэхнікі і нарыхтоўцы процігалалёдных матэрыялаў.

І абследаванні выявілі даволі істотную колькасць хібаў. Адказныя асобы камунальных арганізацый атрымалі 165 прадпісанняў, скіраваных на ліквідацыю недахопаў. А ў мясцовыя выканаўчыя органы паступіла каля сямідзесяці інфармацый, звязаных з правіламі ўтрымання вулічна-дарожнай сеткі.

У ДАІ звярнулі ўвагу, што своечасовае рэагаванне на праблему наўпрост залежыць ад таго, наколькі хутка паступіць інфармацыя аб ёй. Таму, калі вы дзесьці на дарозе прыкмецілі небяспечную з'яву (скажам, слізкае пакрыццё або няспраўнае асвятленне), то паведамляйце пра гэта па тэлефоне дарожнай службы 125. Можна таксама звярнуцца ў тэрытарыяльны орган унутраных спраў або набраць нумар 102.

У сваю чаргу, **старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Аляксандр БРУЙ** нагадаў, што з 1 снежня да 1 сакавіка аўтамабілі з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай да 3,5 тоны ўключна, легкавыя і грузапасажырскія аўтамабілі з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай звыш 3,5 тоны, а таксама аўтобусы з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай да 5 тон павінны быць абсталяваны зімовымі шынамі. Шыны павінны быць прамаркіраваныя знакам у выглядзе горнай вяршыні з трыма пікамі і са сняжынкай унутры яе альбо знакамі M + S, M & S, M S або All Seasons і мець астаткавую вышыню малюнка пратэктара не менш за 4 міліметры.

Прадстаўнік ДАІ таксама расказаў пра некалькі правілаў бяспекі ў зімовы час.

— Асцярожнасць павінны захоўваць усе ўдзельнікі дарожнага руху. Падчас пераходу дарогі трэба быць максімальна ўважлівым і асцярожным, асабліва падчас галалёду або моцнага снегападу. Узімку тармазны шлях аўтамабіля істотна павялічваецца. Калі вы чакаеце на прыпынку грамадскі транспарт, то не стойце блізка да краю праезнай часткі — там можна паслізнуцца. І ў цёмны час сутак пазначце сябе святлоадбівальнымі элементамі.

Петарды пад забаронай

З 12 жніўня ў Беларусі пастановай Савета Міністраў быў забаронены аптовы і рознічны гандаль піратэхнікай. Вета на продаж святочнай выбухоўкі дзейнічае і дагэтуль — да асаблівага рашэння ўрада. Як вынік — у дварах не чуваць кананад і не бачна ў небе салютаў, хоць раней у снежні абстаноўка была зусім іншая.

Праўда, не выключана, што ў кагосьці засталіся старыя запасы піратэхнікі, набытыя яшчэ ў тыя часы, калі петарды, ракеты і феерверкі прадаваліся цалкам легальна. Таму, магчыма, пад самы Новы год мы зноў пачуем і ўбачым іх запускі. Іншая справа — рабіць гэта бяспечна. Летась па ўсёй Беларусі было зафіксавана больш за 60 траўмаў, атрыманых менавіта ад няправільнага выкарыстання небяспечных забавак. Прычым дзве траціны з іх прыйшліся менавіта на петарды. Пра гэта расказаў **начальнік аддзела нагляду за бяспекай утылізацыі боепрыпасаў, вырабу і выкарыстання выбуховых матэрыялаў Дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці МНС Рэспублікі Беларусь Іван ШЫЯНОК.**

— Перш за ўсё, трэба няўхільна выконваць патрабаванні, змешчаныя ў інструкцыі да піратэхнікі, — параіў спецыяліст. — Але пры гэтым можа быць так, што тэкст нанесены на корпус прылады нечытабельным шрыфтам. У такім разе да яе мусіць прыкладацца пісьмовая інструкцыя на асобным лісце.

Яе тэкст павінен быць надрукаваны на рускай або беларускай мове — ніякіх іерогліфаў дакумент змяшчаць не павінен. І разбірацца з петардамі трэба загадзя, да іх падпальвання. Справа ў тым, што спрацоўваюць яны вельмі хутка. Таму, калі агонь ужо падпаліў фіціль, петарду нельга трымаць у руках або, скажам, засоўваць у кішэню. Жаданне правесці выбух унутры шкляной ёмістасці — слоіка ці бутэлькі — прывядзе да таго, што аскепкі ад тары хаатычна разлятуцца на дзясяткі метраў наўкол і нанясуць даволі сур'ёзныя траўмы.

— Таксама хачу нагадаць, што забаронена выкарыстоўваць піратэхнічныя вырабы са скончаным тэрмінам прыдатнасці, разарванай або намоклай упакоўкай, — працягнуў Іван Шыянок. — Запускам іх можа займацца толькі дарослы цвярозы чалавек. Спробы ўнесці нейкія змены ў канструкцыю феерверкаў або разабраць іх могуць прывесці да непрадказальных наступстваў. Для запуску трэба выбраць пляцоўку ўдалечыні ад пабудоў і абавязкова ўлічыць умовы надвор'я, бо пры моцным ветры траекторыя палёту можа змяніцца раптоўна і невядома як. Калі ж піратэхнічны выраб не спрацаваў, трэба пачакаць не менш за пятнаццаць хвілін, перш чым падыходзіць да яго. У інструкцыі, дарэчы, будзе растлумачана, што рабіць у выпадку асечкі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ДЗЕВЯЦЬ ІМЁНАЎ ВЕРНУТЫЯ З НЕБЫЦЦЯ

Сёлетні год для пошукавікаў асаблівы. І справа не ў эпідэмічнай абстаноўцы, на правядзенне вахты гэта ніяк не паўплывала. Яна пачалася і закончылася ў адпаведнасці з раней складзенымі планамі. Асаблівасць у тым, што яна стала самай насычанай і выніковай за апошнія гады. Упершыню байцы абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» правялі даследаванні на Буйніцкім полі, якое ўвайшло ў гісторыю, як месца, дзе цалкам была зламаная фашысцкая хлусня аб непераможнасці нямецкай арміі. Яе імклівае наступленне прыпынілі тут на 23 дні — з 3 да 26 ліпеня 1941 года! Раскопкі вяліся таксама ў Быхаўскім, Чавускім і Слаўгарадскім раёнах — на месцах самых кровапралітных баёў. Як вынік — знойдзены астанкі 109 чалавек і дзевяць імёнаў вернутыя з небыцця. Яшчэ каля 1000 імёнаў байцоў, якія раней значыліся невядомымі, установлена па архіўных звестках.

Чым запомніцца пошукавая экспедыцыя — 2020, у размове з ваенным пісьменнікам, кіраўніком Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалаем БАРЫСЕНКАМ.

Таямніцы Буйніцкага плацдарма

— Сёлета мы ўпершыню праводзілі раскопкі на полі каля вёсак Буйнічы і Цішоўка, — расказвае кіраўнік пошукавага клуба. — За кіламетр ад капліцы, што знаходзіцца на Буйніцкім полі, мы вызначылі камандны пункт палкоўніка Сямёна Куцепава. Адшукаць прыблізныя каардынаты месца, дзе змагаўся пад яго камандаваннем 388-ы стралковы полк і 3-і батальён капітана Гаўрушына дапамаглі архіўныя нямецкія аэрафотаздымкі, якія з'явіліся ў нас летась. Колькі герояў загінула тут і колькі трапіла ў палон, да гэтага часу дакладна невядома. Па афіцыйных даных, абаронцаў Магілёва было каля 30 тысяч. Толькі ў палку Куцепава налічвалася 3,5 тысячы чалавек, а ў батальёне Гаўрушына не менш за тысячу. Дзе загінуў сам Куцепаў, дакладна невядома. Дзесьці пад Магілёвам, а дзе канкрэтна — пытанне. Ёсць як мінімум пяць версій.

Крыўдна, што з дзесяці знойдзеных на Буйніцкім полі медальёнаў ні адзін не раскрыў імя свайго ўладальніка. Звесткі пра тых, хто тут ваяваў, у асноўным бяруцца з архіваў або спецыялізаваных сайтаў. Дарэчы, капліца на Буйніцкім полі была пабудаваная ў 1995 годзе менавіта па рэкамендацыі Мікалая Барысенкі. Сёння на яе сценах значыцца каля 500 імёнаў абаронцаў. А хутка дадасца яшчэ 6000, якія пошукавікі знайшлі на адмысловых сайтах.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Чавускі напрамак

З 14 да 20 верасня пошукавы клуб «Віккру» сумесна з байцамі 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна і добраахвотнікамі абласнога цэнтра творчасці праводзіў раскопкі ў Чавускім і Слаўгарадскім раёнах.

Фронт на берагах Проні стаяў каля дзевяці месяцаў, жорсткія баі ішлі тут з кастрычніка 1943-га да чэрвеня 1944-га. Па афіцыйных даных, тут склала галовы каля 20 тысяч салдат. Але, як лічаць пошукавікі, іх, як мінімум, у два разы болей. Каля вёскі Галавенчыцы сёлета былі паднятыя астанкі трох чырвонаармейцаў, якія загінулі зімой 1943—44 гадоў. А на полі каля вёскі Сутокі адшукалі яшчэ дзесяцярых чырвонаармейцаў і камандзіраў. На жаль, усе яны аказаліся безыменныя. Не атрымалася апазнаць астанкі і тых шасці байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, якія былі паднятыя на наступны дзень у раёне былога льнозавода ў ваколіцах Чавус.

Некаторыя з пошукавікаў працавалі цэлымі сем'ямі, як Мікалай і Святлана Барысенкі, Ала Казючыц і Яўген Бацанаў. У розныя дні ў раскопках было задзейнічана ад 20 да 50 пошукавікаў. Яны адпрошваюцца з работы, ахвяруюць сваімі выхаднымі днямі, а часам нават адпачынкам. І такіх апантаных шмат. Гэта камандзіры груп Павел Кончыкаў, Ягор Шчанаў, Улад Сцепанцоў, Ілья Трыханаў, пошукавікі Арцём Ціхінскі, Анатоль Даронін, Аляксандр Халееў, Андрэй Пруднікаў, Антон Пракапнёў, Дзмітрый Паклонскі, Яўген Грышановіч, Аляксандр Клёмін...

Нават дома пошукі працягваюцца. Падчас разведкі на брустверы аднаго з бліндажоў у лесе каля льнозавода пошукавік Арцём Ціхінскі знайшоў страчаны медаль «За адвагу». А ўжо потым даведаўся, што належаў ён чырвонаармейцу 369-га палка 212-й стралковай дывізіі Івану Іванавічу Кузняцову, 1925 года нараджэння, з Іванаўскай вобласці Расіі. Астанкі салдата, на жаль, знайсці не атрымалася.

Слаўгарадскі штурм

Пра падрабязнасці раскопак у Слаўгарадскім раёне наша газета ўжо пісала. Карэспандэнт «Звязды» асабіста прымала ў іх удзел і бачыла, як самаадданая працуюць пошукавікі, каб як мага далей прасунуцца ў сваіх пошукавых адкрыццях. Так, напэўна, працуюць валанцёры, разгортваючы з-пад абломкаў разбураных дамоў яшчэ жывых людзей. Паспець, вырваць з лап смерці сыходзячае жыццё. Там усё зразумела. Але што кіруе людзьмі, якія шукаюць тых, каму ўжо няма чым дапамагчы? Нас ад тых падзей аддзяляюць дзесяцігоддзі. Байцы «Віккру» гэта пытанне не разумеюць. Бо якія дзесяцігоддзі, калі для памяці не мае значэння час. Тых, хто не вярнуўся з вайны, чакаюць і сёння. І няхай ужо не маці і жонкі, а ўнукі і праўнукі. Гэта пацвярджаюць шматлікія лісты, якія ідуць на адрас клуба і асабіста пошукавікам.

Дзякуючы рабоце з архівамі вярнуўся з небыцця 25-ы мехкорпус, пра які да 1995 года ў Магілёўскай вобласці нават не ведалі. І тыя звесткі, што прывёз з архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі Мікалай Барысенка, сталі сенсацыяй. Цяпер гэтая інфармацыя ўвесь час папаўняецца. У Слаўгарадскім раёне ў ліпені 1941-га 25-ы мехкорпус павінен быў прыкрыць правы фланг і прыняць фашысцкі ўдар на сябе.

Пошукавікі працавалі на былым полі бітвы пад халодным дажджом і парывістым ветрам, але ўжо першы дзень паказаў, што іх работа была не дарэмная. Былі паднятыя дзесяць байцоў і камандзіраў 219-й мотастралковай дывізіі 25-га мехкорпуса з пяццю смяротнымі медальёнамі. Наступны дзень пошукавых работ у Слаўгарадскім раёне быў не менш плённы. На полі каля вёсак Папоўка і Добры Дуб атрымалася знайсці астанкі васьмі чалавек, з якіх не менш трох — камандзіры. Былі знойдзены тры медальёны, а таксама компас з прозвішчам «Ільін» і ініцыяламі на адваротным баку компаса «І.І. І», небяспечная брытва з добра бачнымі ініцыяламі «К.К.І», кацялок з надрапаным на баку подпісам «Шаімуха .. Метаў» — добрыя наводкі для далейшага архіўнага пошуку звестак пра загінулых байцоў і іх сваякоў.

Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, паназіраць за работай ваенных археолагаў прыязджалі навучэнцы прафліцэя і школ №№ 1 і 2 са Слаўгарада, а таксама вучні Васькавіцкай школы. Вельмі кранула тое, што дзеці прывезлі з сабой палявыя кветкі, каб пакласці іх на месцы раскопак.

— Мы заўсёды запрашаем паўдзельнічаць у нашых вахтах памяці школьнікаў, навучэнцаў, студэнтаў і працуючую моладзь, — кажа Мікалай Барысенка. — У пошуках на чавускай зямлі нам дапамагалі навучэнцы і педагогі гарадской школы № 2, а таксама Вусцянскай базавай школы Чавускага раёна. Некаторыя з хлопцаў праявілі да раскопак непадробную цікавасць, некаторыя нават выказалі жаданне ў будучым заняцца пошукам. І гэта, лічу, найлепшы спосаб патрыятычнага выхавання. Калі моладзь бачыць астанкі забітых падчас вайны сваіх аднагодкаў з прастрэленымі чарапамі, перабітымі рукамі і нагамі, пачынае інакш цаніць тое, што ў нас ёсць. Пасля гэтага вельмі малы шанц, што яны пойдуць на плошчы і вуліцы з патрабаваннем еўрапейскіх каштоўнасцяў. Калі бачыш гэтыя знішчаныя вайной маладыя жыцці, па-іншаму ўспрымаеш сучаснасць і разумееш, што сапраўды мае каштоўнасць. І пачынаеш цаніць Айчыну такой, якая яна ёсць.

Вернутыя імёны

Кожны год байцы клуба «Віккру» вяртаюць з небыцця ўсё новыя і новыя імёны тых, хто не прыйшоў з Вялікай Айчыннай вайны. Толькі падчас пошукавых работ у Чавускім і Слаўгарадскім раёнах былі знойдзены астанкі 38 салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі, якія лічыліся прапаўшымі без вестак, і восем смяротных медальёнаў.

Ужо на наступны дзень пасля завяршэння экспедыцыі ў Слаўгарадскім раёне атрымалася ўстанавіць поўныя даныя аб адным з загінулых. Іх адшукаў на АБД «Мемарыял» пошукавік Дзмітрый Паклонскі, узяўшы за аснову надпіс на знойдзеным на месцы былых баёў компасе «Ільін» і фрагменты знойдзенага ліста Ільіна роднаму брату. Цяпер вядома, што на полі пад Слаўгарадам па-геройску загінуў Іван Ільіч Ільін, 1919 года нараджэння, ураджэнец Ронгінскага раёна Марыйскай АССР. Аператыўна была ўстаноўлена і сувязь з роднымі Ільіна, якія сёння жывуць у Рэспубліцы Марый Эл.

Па выніках экспедыцыі «Дняпроўскі рубеж — 2020» было ўстаноўлена імя Мікалая Парфір'евіча Карнавухава, 1915 года нараджэння, ураджэнца Дзмітрыеўскага раёна Курскай вобласці. Чырвонаармеец быў прызваны ў 1941 годзе Дзмітрыеўскім РВК. З небыцця вернуты радавы Пётр Міхайлавіч Шаўцоў, 1915 года нараджэння, ураджэнец Іркуцкай вобласці, а таксама Мікалай Ягоравіч Грыненка, 1921 года нараджэння, ураджэнец Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці з вёскі Суздалеўка. Летась апошні быў перапахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Аляксандраўка-1 Слаўгарадскага раёна. А сёлета мясцовыя жыхары перадалі пошукавікам яго смяротны медальён.

Астанкі знойдзеных падчас сёлетняй экспедыцыі байцоў і камандзіраў былі ўрачыста перапахаваныя ў Чавускім і Слаўгарадскім раёнах.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

P.S. *Вялікую дапамогу ў пошуках аказалі абласны цэнтр творчасці, раённы аддзел НС Чавускага раёна, Магілёўскі мясакамбінат, аддзелы ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, а таксама адукацыі, спорту і турызму Чавускага і Слаўгарадскага райвыканкамаў. Абласны гісторыка-патрыятычны клуб «Віккру» прыносіць ім шчырыя словы ўдзячнасці за дапамогу ў такой вельмі значнай справе.*

Мікалай ЧАРГІНЕЦ:

«Слова пісьменніка запатрабавана паўсюдна»

Саюз пісьменнікаў Беларусі нядаўна адзначыў сваё 15-годдзе. Пра традыцыі і навацыі ў літаратурным жыцці краіны інтэрв'ю з яго старшынёй Мікалаем ЧАРГІНЦОМ.

— Як вядома, Саюз пісьменнікаў Беларусі з'яўляецца пераемнікам творчай арганізацыі літаратараў, створанай у 1934 годзе пры ўдзеле класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы, Я. Коласа. І таму, безумоўна, гісторыя нашай арганізацыі мацуецца на найлепшых традыцыях выдатных майстроў мастацкага слова, на чыіх кнігах вырасла не адно пакаленне беларусаў, — гаворыць Мікалай Іванавіч.

Саюз пісьменнікаў Беларусі ў сваім сучасным стане арганізаваўся пасля таго, як пэўная частка літаратараў заняла пазіцыю супрацьстаяння дзяржаве і яе ўладзе. Палітыка стала пераважаць над літаратурай, якая, варта нагадаць, з'яўляецца відам мастацтва. Слова пачало станавіцца разбуральным.

Тады было прынята рашэнне стварыць Саюз пісьменнікаў Беларусі. Яго падтрымалі тыя, хто дбаў пра сапраўднае прызначэнне літаратуры, клапаціўся пра яе стваральную ролю ў жыцці грамадства. Гэтыя прынцыпы застаюцца нязменныя і зараз.

У цяперашні складаны перыяд палітычнай актыўнасці некалькі чалавек сапраўды выйшлі з арганізацыі, адзін выключаны на Прэзідыуме СПБ. За сёлетні год прынята 10 новых літаратараў. Прыёмная камісія разглядае дакументы іншых прэтэндэнтаў. Нашы шэрагі мацуюцца.

15 гадоў — для СПБ юбілей хутчэй умоўны. Яго значнасць у тым, каб падсумаваць зробленае, намеціць планы на далейшае. Наогул, асэнсаваць, як развіваецца сучасны літаратурны працэс? Як слова пісьменніка адгукаецца ў грамадстве?

— У такім разе, што ўяўляе сабой сёння Саюз пісьменнікаў Беларусі?

— У складзе нашага Саюза амаль 700 літаратараў. У сталіцы і кожнай вобласці працуюць аддзяленні, якія не толькі аб'ядноўваць вакол сябе саміх творцаў. Клопат творчай супольнасці — праз кнігу, найлепшыя творы класікаў і сучаснікаў перадаваць грамадству накоплены стагоддзямі вопыт, пашыраць светаўспрыманне, вучыць чалавечым каштоўнасцям, абуджаць найлепшыя пачуцці.

Самае вялікае — Мінскае гарадское аддзяленне, налічвае больш за 300 паэтаў, празаікаў, драматургаў, дзіцячых пісьменнікаў. Яны прымаюць актыўны ўдзел у культурным жыцці сталіцы. Пад кіраўніцтвам вядомага паэта, старшыні аддзялення Міхася Пазнякова праводзяць конкурсы чытальнікаў, літаратурныя конкурсы. Вядомасць набыў, створаны аддзяленнем на базе бібліятэкі імя Я. Купалы ў Мінску Тэатр паэзіі.

Важна, што дзякуючы намаганням сяброў абласных аддзяленняў, і ў прыватнасці іх старшынь, літаратурнае жыццё віруе і ў глыбінцы. Для нас важны кожны творчы чалавек. Ухваляем тых пісьменнікаў, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, руплівa вядзе краязнаўчыя даследаванні. Гады малой радзімы прынеслі вельмі істотны літаратурны плён. З'явілася многа новых, вельмі змястоўных выданняў, прысвечаных гарадам, вёскам, малым паселішчам. Усё гэта па макулінцы, па радку складае вялікую кнігу Радзімазнаўства.

У Саюзе пісьменнікаў працуюць адзінацаць секцый адпаведна розным літаратурным жанрам. Прыемна ажыўленая работа секцыі паэтаў-песеннікаў. Ганарымся высокай ацэнкай песеннай творчасці паэта Івана Юркіна, які за альбом «Дзе каліна цвіла» разам з Анатолем Ярмоленкам і Алегам Елісеенкавым атрымаў прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне мастацтва і культуры. А вось у драматургіі, на жаль, пэўны спад. Ужо два гады запар у гэтай намінацыі не прысуджалася Нацыянальная літаратурная прэмія.

Штогод нашымі аўтарамі выдаецца прыкладна 250 кніг і праводзіцца не менш за 20 тысяч сустрэч, прэзентацый, імпрэз, музычна-паэтычных вечарын на самых розных пляцоўках: у бібліятэках, школах, студэнцкіх аўдыторыях і інтэрнатах, у працоўных калектывах, воінскіх часцях. Жывое слова пісьменніка запатрабавана паўсюдна.

— Вы ўпэўнены ў тым, што кніга не страчвае свае пазіцыі, у процівагу актыўнаму ўплыву інтэрнэту, аб чым зараз так многа гаворыцца.

— У тым, што кніга з'яўляецца неперавыдзенай каштоўнасцю, не варта нават сумнявацца. Францыск Скарына пяць стагоддзяў таму ўвекавечыў сваё імя як першадрукар. А яшчэ больш ён уславіў — кнігу, якая праз вякі застаецца для чалавека невычэрпнай крыніцай яго духоўнасці. Ужо добра разабраліся ў тым, як чалавек успрымае тэкст, прачытаны ў электронным выглядзе і ў кнізе. Абсалютная розніца. За кнігай — будучыня. Краіны, якія рупяцца пра сваю канкурэнтаздольнасць у свеце і надалей, цяпер прыкладаюць шмат намаганняў для заахвочвання дзяцей да чытання. Ёсць глыбокае разуменне таго, якую мудрасць нясуць кнігі: выхоўваюць інтэлектуальна развітога чалавека.

— І, напэўна, патрыёта таксама?

— Як прадстаўнікі творчай супольнасці мы знаходзімся ў цэнтры культурнага жыцця краіны і бачым жорсткую барацьбу за розумы, асабліва маладога пакалення. Поспех гэтага рэваншу перамясціўся ў інтэрнэт. Калі тэлеграм-каналы і іншыя крыніцы ў сацыяльных сетках, аказваюць істотны ўплыў на фарміраванне грамадскай думкі. Ідэолагамі, на бяду, становяцца тыя, хто нясе негатыў і хоча падарваць асновы беларускай дзяржаўнасці.

Мы глыбока занепакоены тым, што тыя магчымасці выхавання асобы, якія мае пісьменнік, застаюцца недастаткова запатрабаваныя. Асабліва гэта датычыцца патрыятычнага выхавання. СПБ мае вялікі вопыт у гэтым кірунку і гатовы адгукнуцца на любыя запрашэнні творчага характару, у тым ліку і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Напрыклад, пачынаючы з 2011 года па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Мемарыяльнай зале Дома літаратара ў Мінску праходзяць урокі Мужнасці, на якіх пісьменнікі вядуць шырокі дыялог з вучнямі мінскіх школ аб вайне і міры, памяці і забыцці. Пасля ўрокаў Мужнасці іх удзельнікі ідуць на плошчу Перамогі да Вечнага агню, каб там схіліць свае галовы перад неўміручым подзвігам народа. Гэта вельмі ўражальная падзея ў жыцці школьніка.

Да 75-годдзя Вялікай Перамогі СПБ быў праведзены міжнародны літаратурны конкурс. Яго ўдзельнікамі стала больш за 1300 чалавек з Расіі, ЗША, Ізраіля, Канады, Кітая, краін постсавецкай прасторы. Конкурс паказаў, наколькі ўважліва прыцягнуты да Беларусі позіркі сусветнай грамадскасці, паважлівае стаўленне да краіны і яе мінулага, жаданне людзей усяго свету жыць у міры.

Пісьменнікі імкнуцца, каб патрыятычнае выхаванне садзейнічала фарміраванню свядомай асобы з разуменнем грамадзянскай адказнасці за сваё жыццё і за лёс краіны.

— Важна, каб у літаратуру прыходзілі маладыя таленты.

— Для СПБ вельмі актуальная тэма — адкрыццё новых імёнаў. Век наш становіцца ўсё больш імклівым, інфармацыйна насычаным і таму надзвычай цікава, як асэнсоўваюць сучасныя перамены маладыя творцы, якой яны бачаць будучыню. Многае, аб чым раней пісалі фантасты, стала явай. Якія прагнозы пісьменнікі зробяць надалей?

Прыемна штогод на Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы віншаваць пераможцаў Міжнароднага конкурсу літаратараў «Першацвет», суарганізатарам якога з'яўляецца СПБ. Дзесяць маладых паэтаў і дзесяць празаікаў, чые творы прызнаюцца найлепшымі, далучаюцца да новай літаратурнай плыні. Як у далейшым складуцца іх творчыя лёсы — пакажа ўсёведны час. Але тое, што моладзь прыхільная да літаратуры, — справы, скажу, далёка не грашовай, — адназначна. Цешыць гэты шчыры інтарэс.

Вызначаць найбольш адораных аўтараў дапамагаюць шматлікія літаратурныя гуркі, створаныя ў сталіцы і ў райцэнтрах пры бібліятэках, рэдакцыях газет. Яны працуюць пры падтрымцы абласных аддзяленняў, якія садзейнічаюць выхаду першых кніг. У Мінскім гарадскім аддзяленні наогул на працягу многіх гадоў выдаецца серыя «Маладыя галасы». Так адшукваюцца і росцяцца таленты, якія ў далейшым папаўняюць пісьменніцкую арганізацыю.

— Саюз пісьменнікаў Беларусі, наколькі вядома, адкрытая і для замежных аўтараў арганізацыя. Раскажыце пра міжнародныя кантакты літаратараў СПБ.

— Адкрытасцю нашага Саюза карыстаюцца многія знакамітыя замежныя аўтары. Яны лічаць для сябе гэта вельмі пачэсным. Як і мы, у сваю чаргу, радуемся іх актыўнай прапагандзе беларускай літаратуры за мяжой. Больш за тое, гэтыя людзі шмат расказваюць, пішуць пра нашу краіну, што дапамагае народам бліжэй пазнаваць і разумець адзін аднаго. Вялікую актыўнасць у гэтым плане праяўляюць Андрэй Разін (Расія), Керымхан Умаханаў (Расія, Дагестан), Святлана Ананьева (Казахстан), Юрый Іваноў (Малдова).

Акрамя таго, Саюзам пісьменнікаў Беларусі заключана больш за 40 дамоў з рознымі замежнымі пісьменніцкімі арганізацыямі, творчымі Саюзамі. СПБ сузаснавальнік Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы.

Літаратурнае сяброўства — вялікая дыпламатыя!

— А як, на ваш погляд, у Беларусі цяпер ідуць справы з кнігамі і кнігавыданнем?

— Кніга ў пашане і ў беларусаў. Аб гэтым сведчаць такія маштабныя дзяржаўныя святы, як Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, Дзень беларускага пісьменства. Але мы не можам сказаць, што з кнігай у нас усё добра. Пісьменнікі выдаюць свае творы за смешныя ганарары, пражыць за якія проста немагчыма. Таму вымушаны зарабляць сабе на хлеб іншай прафесіяй, знаходзячы вольны для творчасці час у прамежках з асноўнай работай.

Кнігі з-за мяжы, у прыватнасці расійскія, каштуюць нярэдка значна танней за беларускія. Прапанова Саюза пісьменнікаў перагледзець падатковую сістэму на карысць айчынных выданняў, застаецца непачутая. А гэта непасрэдна звязана з цяжкасцямі продажу кніг, адпаведна са складаным фінансавым становішчам выдавецтваў. І з такой няпростай для пісьменніка праблемай: дзе выдацца?

— Саюз пісьменнікаў Беларусі вядомы сваёй твёрдай пазіцыяй па многіх пытаннях. І ў вас, паважаны Мікалай Іванавіч, ёсць вялікі вопыт у многім іх станоўчага вырашэння.

— Безумоўна, будзем праяўляць настойлівасць і надалей, каб тое, што хвалюе пісьменнікаў, вырашалася. Галоўная сутнасць нашых памкненняў — фарміраваць нацыянальную самасвядомасць беларусаў, тую, якая адпавядае нашым традыцыйным, вывераным часам каштоўнасцям.

І вельмі важна, што ў гэтым кірунку маем падтрымку з боку Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, міністэрстваў інфармацыі і культуры, кіраўніцтва аблвыканкамаў. Летась, напрыклад, плённа прайшоў пленум Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы дзякуючы выдатнай арганізацыі мерапрыемства з боку Магілёўскага аблвыканкама. Саюз пісьменнікаў у добрым кантакце і з іншымі міністэрствамі, установамі, грамадскімі арганізацыямі, у прыватнасці з БРСМ. Шануем сяброўства з музеямі, бібліятэкамі, школамі, навучальнымі ўстановамі. Арганізаваныя супольна мерапрыемствы прыносяць заўсёды вельмі станоўчы вынік.

Спадзяёмся, што і зараз знойдзе водгук шэраг прапаноў, звязаных з арганізацыяй у Доме літаратара дыскусійнага клуба з удзелам моладзі, аднаўленнем спецыяльных стыпендый для маладых літаратараў. Мяркуем праводзіць больш конкурсаў патрыятычнага кірунку, у тым ліку і міжнародных. Большую ўвагу аддадзім дзіцячай літаратуры і чытанню, асабліва на роднай мове.

Не трацім надзеі і на добраўпарадкаванне Парку пісьменнікаў. Як вядома, унікальны аб'ект — Парк пісьменнікаў, створаны нашым Саюзам, размясціўся ў зялёнай зоне побач з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. І калі там з'явіцца спецыяльная пляцоўка для выступленняў, а гарадскія ўлады гэта абяцаюць, то творчыя сустрэчы пісьменнікаў, аўтограф-сесіі, літаратурныя вечарыны, дні паэзіі, дэманстрацыі спектакляў, конкурсы сярод чытальнікаў — усё гэта зробіць наш парк прывабным месцам адпачынку для мінчан і гасцей сталіцы.

— Мікалай Іванавіч, а што вы можаце сказаць пра сваю каманду?

— У ёй працуюць вельмі захопленыя сваёй справай людзі і вельмі арганізаваныя. Асабістую творчасць ім даводзіцца сумяшчаць з бязліччу грамадскіх спраў. Калі праводзяцца культурныя мерапрыемствы, рабочы дзень можа доўжыцца да позняга вечара.

Я дзякую ўсім, з кім маю даўняе супрацоўніцтва, — сваім намеснікам, старшыням абласных аддзяленняў, наогул усёй пісьменніцкай грамадзе, шматлікім нашым сябрам за прыхільнасць да Саюза і за шчырае жаданне дарыць людзям радасць добрага слова.

Жадаю ўсім шчаслівага Новага года! Давайце аб'ядноўваць намаганні, каб мацавалася родная Беларусь!

— А чым асабіста пісьменнік Мікалай Чаргінец парадуе чытача?

— Напісаны новы раман. Лёс яго героя вельмі пакручасты. Засталося высветліць, якое выдавецтва возьмецца за выданне.

Марыя ЛІПЕНЬ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

11 снежня 2020 г. № 47 (583)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

САЦЫЯЛЬНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ЗАХАВАЕЦЦА

Пад кіраўніцтвам спікера верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ на базе галаўнога офіса Беларусбанка адбылося выязное пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі на тэму «Аб прапанаваных мерах па забеспячэнні збалансаванасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў у 2021 годзе».

Фота БелТА.

НАПЯРЭДАДНІ ПРЫНЯЦЦЯ БЮДЖЭТНАГА ПАКЕТА

Спікер Савета Рэспублікі звярнула ўвагу прысутных на прыярытэты бюджэтнай палітыкі дзяржавы: сацыяльную абароненасць насельніцтва і рост дабрабыту грамадзян шляхам павелічэння заработнай платы. А ў сённяшняй сітуацыі найважнейшым якасным арыенцірам для ўсёй вертыкалі ўлады павінна стаць эфектыўнае і рацыянальнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў.

Арганізатарам гэтай сур'ёзнай і своечасовай дыскусіі сталі члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. Яе **старшыня Таццяна РУНЕЦ** паведаміла, што для размовы былі запрошаны эксперты, спецыялісты Міністэрства фінансаў, якія расказалі сенатарам аб падходах да фарміравання бюджэту. Увогуле актуальнасць гэтага выязнога пасяджэння яшчэ і ў тым, што ў снежні Савет Рэспублікі штогод разглядае бюджэтны пакет налета. І тое, што сенатары ўжо цяпер пачалі работу па вывучэнні асноўных фінансавых дакументаў, факт, безумоўна, станоўчы, лічыць Таццяна Рунец, бо збалансаванасць рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў — гэта адно з самых актуальных пытанняў на бягучы момант для заканатворцаў. Старшыня профільнай камісіі падкрэсліла, што бюджэт захоўвае сваю сацыяльную накіраванасць. Па выніках абмеркавання выпрацаваны канкрэтныя прапановы і кірункі далейшай сумеснай работы з Міністэрствам фінансаў, якія будуць рэалізаваны.

Паводле слоў Таццяны Рунец, усе так званыя «ковідныя» выплаты медыцынскаму персаналу будуць забяспечаны, падтрымку атрымаюць пенсіянеры, шматдзетныя сем'і — на будаўніцтва жылля і г. д. Інакш кажучы, цяперашняя сацыяльная палітыка дзяржавы захаваецца і ў наступным годзе.

УВАГА РЭГІЁНАМ

З улікам таго што Савет Рэспублікі з'яўляецца органам тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, сенатараў заўсёды хвалюе развіццё рэгіёнаў. На гэтым невыпадкова быў зроблены асноўны акцэнт падчас работы выязнога пасяджэння, у прыватнасці, на тым, каб усе запланаваныя выдаткі былі забяспечаны фінансаваннем.

Трэба адзначыць, што на сённяшні дзень бюджэты рэгіёнаў збалансаваныя, іх сацыяльная накіраванасць захоўваецца. **Намеснік міністра фінансаў Алена ПЕЧАНЬ** удакладняе лічбы: аб'ём даходаў мясцовых бюджэтаў вызначаны ў памеры 22,5 мільярда рублёў, або з прыростам на 5,7 % да 2020 года. Прычым з мэтай павышэння самастойнасці мясцовых бюджэтаў і стымулявання эканамічнага развіцця рэгіёнаў прадугледжваецца залічэнне ў поўным аб'ёме ў мясцовыя бюджэты плацяжоў за выкіды забруджвальных рэчываў, за скід сцёкавых вод, за захоўванне адходаў вытворчасці, ад продажу зямлі ва ўласнасць замежным дзяржавам.

Разам з тым фарміраванне бюджэтаў раёнаў ажыццяўляецца ў рамках бюджэтнага заканадаўства. «Бюджэтны кодэкс у гэтым годзе не карэктуецца. Таму бюджэты раёнаў фарміруюцца ва ўстаноўленым парадку ў рамках тых рашэнняў, якія будуць прымаць у тым ліку і сесіі абласных Саветаў дэпутатаў па размеркаванні нарматываў паміж абласцямі і раёнамі», — адзначыла Алена Печань.

У зале таксама прысутнічалі і актыўна ўдзельнічалі ў размове старшыні абласных і асобных раённых Саветаў дэпутатаў. Іх меркаванні, слушныя прапановы, погляды на фарміраванне бюджэтаў рэгіёнаў уважліва выслухалі. Напрыклад, **старшыня Крычаўскага раённага Савета дэпутатаў Ірына ПРУДНІКАВА** проста і даходліва расказала аб буднях мясцовай улады раёна: намаганнях па прыцягненні ў яго эканоміку прамых замежных інвестыцый, крыніцах папаўнення мясцовага бюджэту, падтрымцы малога бізнесу, мерах па працаўладкаванні беспрацоўных.

ВЫДАТКІ НА 2021 ГОД

Бюджэт на наступны год захавае сацыяльную накіраванасць. Прыярытэт — павышэнне дабрабыту грамадзян. Ужо прынята рашэнне ўрада па павышэнні базавай стаўкі з 185 да 195 рублёў. Дадаткова ў будучым годзе закладваецца 50 мільёнаў рублёў на апераджальны рост заработнай платы нізкааплатных катэгорый грамадзян. Прадугледжваюцца ў неабходных аб'ёмах надбаўкі ўрачам за работу ва ўмовах пандэміі. Сумарна фонд аплаты працы ў бюджэце складзе 38 % усіх яго расходаў, паведаміла журналістам Алена Печань па выніках пасяджэння.

У 2021 годзе рост ВУП будзе на ўзроўні 101,8 %, даходы рэспубліканскага бюджэту плануюцца ў суме 23 мільярды рублёў, што на 1,2 мільярда больш за чаканае выкананне 2020 года. На сямейны капітал мяркуецца накіраваць, па словах намесніка міністра, вельмі значныя рэсурсы — 342 мільёны рублёў. Больш за мільярд будзе выдаткавана на падтрымку шматдзетных сем'яў у будаўніцтве жылля. Бюджэт наступнага года плануецца з дэфіцытам. Паводле папярэдніх ацэнак, ён не перавысіць 3 % ВУП.

Увогуле выдаткі рэспубліканскага бюджэту плануюцца ў суме 27,1 мільярда руб, або 104,4 працэнта да ацэнкі 2020 года. З рэспубліканскага бюджэту ў 2021 годзе на фінансаванне сацыяльнай сферы прадугледжваецца накіраваць 5,5 мільярда рублёў, або на 13,2 % больш за чаканае выкананне 2020 года.

ГРОШЫ НА БАРАЦЬБУ З «КОВІДАМ»

Начальнік галоўнага ўпраўлення фінансавання сацыяльнай сферы і навукі Міністэрства фінансаў Таццяна АСТРЭЙКА ў размове з журналістамі сказала, што на закупку вакцыны ад каранавіруснай інфекцыі ў 2021 годзе прадугледжана выдаткаваць 50 мільёнаў рублёў на закупку двух мільёнаў доз вакцыны ад каранавіруса. Паводле яе слоў, «мы гатовыя да процідзеяння інфекцыі. Сёлета на гэтыя мэты ўжо накіравана каля 500 мільёнаў рублёў у выглядзе прамых выплат». Яна адзначыла, што лячэнне ад каранавіруснай інфекцыі ў залежнасці ад цяжкасці захворвання складае ў разліку на аднаго пацыента ад 300 да 3300 рублёў. Для параўнання: закупка вакцыны на аднаго чалавека абыдзецца прыкладна ў 30 рублёў, што дае значны эфект. «Мы зможам не толькі сфарміраваць калектыўны імунітэт у грамадстве, але яшчэ значна сэканоміць сродкі для таго, каб гэтыя рэсурсы былі накіраваны на аснашчэнне і ўмацаванне сістэмы аховы здароўя ў цэлым», — кажа Таццяна Астрэйка.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Новы фармат

Прамая лінія ў анлайн-рэжыме

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА ў суботу, 5 снежня, правёў прамую лінію. Паназіраць за яе ходам змаглі не толькі журналісты, але і ўсе ахвотныя.

У прыватнасці, была арганізавана прамая трансляцыя ў сацыяльных сетках. Упершыню іх карыстальнікі змаглі далучыцца да працэсу і пачуць, з якімі пытаннямі звяртаюцца падчас правядзення прамых тэлефонных ліній заяўнікі. Геаграфія званкоў была разнастайная: з розных куткоў краіны людзі тэлефанавалі, каб расказаць аб тым, што іх хвалюе. Напрыклад, гучалі просьбы пасадзейнічаць у пераводзе ацяплення жылога будынка, на электрычнасць замест выкарыстання дроў, газу і торфабрыкетаў, як гэта адбываецца цяпер. Жыхарка аднаго з райцэнтраў наракала на дзеянні суседа, які, маўляў, пасля рамонту сапсаваў яе жылое памяшканне да такога стану, што жыць у ім стала немагчыма. Работнік адной з прыватных фірмаў прысталічнага рэгіёна агучыў праблему: былы наймальнік не разлічыўся за выкананую работу. Зараз змяніўся ўласнік, а доўг да гэтага часу застаўся.

Адзін з мінчан, які патэлефанаваў у Савет Рэспублікі, паскардзіўся на дзеянні неканструктыўна настроеных жыхароў мікрараёна, якія псуюць надпісамі агульную і ўласную маёмасць суседзяў. Маўляў, нават на машынах пачалі з'яўляцца надпісы. Можа, наспеў ужо час на заканадаўчым узроўні вырашыць праблему і забараніць незарэгістраваную сімволіку, якая выкарыстоўваецца падчас пратэсных акцый?

Гучалі і прапановы па паляпшэнні эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці, больш дакладна Анатоль Ісачанка пазнаёміўся з імі на наступны дзень, прапанаваўшы заяўніку сустрэцца ў Савеце Рэспублікі: нядзеля, як даведаліся гледачы трансляцыі, таксама аказалася ў яго працоўнай.

На думку віцэ-спікера Савета Рэспублікі, работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб з'яўляецца першачарговай для ўсіх дзяржаўных служачых.

— Мы практыкуем розныя фарматы ўзаемадзеяння з грамадзянамі: прамыя тэлефонныя лініі, прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях у Савеце Рэспублікі, а таксама выязныя прыёмы, — адзначыў ён. — Улада адкрыта, мы чуем кожнага і гатовы дапамагаць усім, хто мае ў гэтым патрэбу, таму імкнёмся ўсяляк пашырыць каналы камунікацыі з выкарыстаннем сучасных тэхналогій у гэтым важным пытанні. Фармат такой прамой лініі з'яўляецца выразным прыкладам таго, што ў рабоце дзяржаўных органаў патрэбы і праблемы людзей займаюць галоўнае месца.

Нагадаем, што да гэтага Анатоль Ісачанка практыкаваў правядзенне тэматычных стрымаў у сацсетках.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Задача — пабудова салідарнага грамадства

У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова прайшоў семінар «Ідэалогія нацыяналізму і экстрэмізму як фактар пагрозы нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь».

У мерапрыемстве ўдзельнічалі старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Ігар Марзалюк, член Савета Рэспублікі Алег Дзячэнка, дэканы, выкладчыкі і студэнты ВНУ.

— Да пэўнага часу многім здавалася, што нацызм і экстрэмізм — гэта недзе далёка і нас не датычыцца. Але апошнія падзеі паказваюць: для часткі беларускага грамадства характэрна няведанне элементарных гістарычных фактаў, традыцый, і гэта няведанне, на жаль, становіцца часткай нашага жыцця, — адзначыў у размове з журналістамі Ігар Марзалюк. — Сёння неабходна казаць пра патрыятызм, барацьбу з нацызмам і экстрэмізмам, і як гэта працуе ў іншых прававых сістэмах, у тым ліку Германіі. Важна не дапусціць перапісвання гісторыі, асабліва Вялікай Айчыннай вайны, не ператвараць яе ў савецка-нямецкую, не мяняць партызанскі дыскурс на дыскурс паліцаяў, карнікаў і Беларускай краёвай абароны.

Падводзячы вынік семінара, удзельнікі адзначылі, што галоўнай задачай з'яўляецца пабудова салідарнага грамадства, заснаванага на пазітыўных гуманістычных каштоўнасцях. Грамадзяне, якіх бы палітычных поглядаў яны ні прытрымліваліся, не павінны гаварыць паміж сабой на дэструктыўнай мове нянавісці, якую культывуюць радыкальныя ідэалогіі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з сайта МДУ імя А. Куляшова.

❍ У тэму

У Партызанскім раёне сталіцы прайшоў адкрыты дыялог пад назвай «Беларусь — гэта мы»!

У сустрэчы і шчырай размове з маладымі прадстаўнікамі працоўных калектываў раёна разам з кіраўнікамі раёна таксама ўдзельнічаў дэпутат Мінскага гарадскога Савета Раман Ніканаў.

Спектр абмеркаваных тэм вельмі разнастайны. Маладыя суразмоўцы выказваліся і аб бягучым палітычным моманце, і аб дзейнасці дыялогавых пляцовак у раёнах горада, ролі і ўплыве сацыяльных сетак на фарміраванне светапогляду моладзі, і наконт іншых актуальных пытанняў. У прыватнасці, зайшла гаворка аб мэтазгоднасці стварэння прафсаюзаў на прыватных прадпрыемствах, умовах атрымання прадстаўнікамі працоўнай моладзі далейшай адукацыі, будаўніцтва для іх жылля ў раёне.

Леанід ТУГАРЫН.

Пошук рашэнняў праз адкрыты дыялог

Канструктыўныя ініцыятывы ўдасканальвання заканадаўства выказалі жыхары Гомельскага раёна падчас правядзення грамадскай прыёмнай. Прапановы грамадзян дапамогуць скарэктаваць механізмы дзяржпадтрымкі, пытанні сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця краіны, упэўнены лідары прафсаюзаў і грамадскіх арганізацый, якія аналізуюць звароты людзей.

Фота Марыны ВАСІЛЬЕВАЙ.

> Адно з ключавых меркаванняў — мясцовым органам улады трэба даць больш паўнамоцтваў у рашэнні выбару стратэгіі развіцця населеных пунктаў. Вялікае значэнне для павышэння ролі мясцовага самакіравання мае стварэнне эфектыўных прававых механізмаў для рэалізацыі ініцыятыў грамадзян.

Сацыяльны педагог Прыбарскага дзяржаўнага прафесійнага аграрна-тэхнічнага ліцэя Таццяна ДАНЯНКОВА ў тэлефоннай размове закранула тэму патрыятызму. Жанчына лічыць, што неабходна больш актыўная прэзентацыя каштоўнасцяў беларусаў і дасягненняў краіны. Гэту работу неабходна праводзіць сістэмна са школы:

— Калі мы хочам выхоўваць патрыятызм з дзяцінства, патрэбны новы маладзёжны фармат. Напрыклад, камп'ютарныя гульні пра беларускую гісторыю, інтэрактыўныя квэсты, якія сталі б цікавай формай вывучэння гісторыі краіны.

Заатэхнік-селекцыянер ААТ «Сцяг Радзімы» Алёна ШВАЙЛІКАВА пераканана, што ў сацыяльных сетках трэба больш расказваць пра спартыўныя і творчыя дасягненні моладзі:

— Сацыяльныя сеткі сталі часткай жыцця падрастаючага пакалення, а значыць, яны павінны адлюстроўваць яго інтарэсы. У нас шмат спартыўных, мэтанакіраваных і таленавітых дзяцей. Ёсць поспехі, пра якія важна расказаць. Вельмі крыўдна, калі ў віры інфармацыі маладыя людзі губляюцца, іх заслугі не бачныя, а тым часам імі можа ганарыцца ўся краіна.

Таксама Алёна Швайлікава лічыць, што прыйшоў час інтэнсіўнага развіцця маладзёжнага прадпрымальніцтва:

— Развіваць прадпрымальніцкую ініцыятыву трэба са школы, расказваючы дзецям пра асновы вядзення бізнесу. Гэта магло б дапамагчы ім сарыентавацца ў пытаннях выбару прафесіі. Можна запрашаць на інфармацыйныя гадзіны паспяховых людзей, прадпрымальнікаў. Добрай формай папулярызацыі гэтай дзейнасці могуць стаць выезды на прадпрыемствы, а таксама арганізацыя інтэрактываў.

Першы сакратар раённай арганізацыі ГА «БРСМ» Ганна САВЕНКА ў канцы адзначыла, што ініцыятывы, якія паступілі ў грамадскую прыёмную, будуць вывучаны і прааналізаваны.

Між тым, дыялог з насельніцтвам пастаянна вядуць кіраўнікі службаў райвыканкама і грамадскіх арганізацый. На сустрэчах з людзьмі ў грамадскай прыёмнай агучваюцца праблемы, ідзе пошук рашэнняў. **Старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Віктарыя ЛАДУЦЬКА** кажа, што праблемы самыя розныя: яны датычацца землекарыстання, якасці электразабеспячэння і вулічнага асвятлення, падаткаабкладання і добраўпарадкавання, узнімаюцца пытанні жылля і водазабеспячэння:

— Адно з ключавых меркаванняў — мясцовым органам улады трэба даць больш паўнамоцтваў у рашэнні выбару стратэгіі развіцця населеных пунктаў. Вялікае значэнне для павышэння ролі мясцовага самакіравання мае стварэнне эфектыўных прававых механізмаў для рэалізацыі ініцыятыў грамадзян.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ПРАПАНУЙЦЕ — ВАС ПАЧУЮЦЬ

У Мінскай вобласці працягваюцца дыялогавыя пляцоўкі, на якіх грамадскія актывісты, прадстаўнікі маладога пакалення, жыхары рознага ўзросту выказваюць прапановы па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю краіны, па ўдасканаленні айчыннага заканадаўства з тым, каб рэгіён, горад, малы населены пункт развіваліся больш дынамічна.

На дыялогавую пляцоўку ва Уздзенскім Доме культуры сабраліся кіраўнікі і спецыялісты сельгасарганізацый і прадпрыемстваў, раённых упраўленняў па сельскай гаспадарцы і харчаванні, фермерскіх гаспадарак, навуковых установ Міншчыны. Прычым не толькі Уздзенскага раёна, але і Капыльскага, Клецкага, Любанскага, Барысаўскага, Мядзельскага і іншых.

> На думку многіх, сельвыканкамы і дэпутаты сёння абмежаваныя ў фінансавых магчымасцях, каб дапамагаць людзям. Праўда, некаторыя сельсаветы зарабляюць за кошт сродкаў ад продажу зямельных участкаў, але ідуць яны не ў іх бюджэт.

Чаму менавіта праблемы сельскай гаспадаркі абмяркоўвалі ўдзельнікі сустрэчы? Усё проста — ледзь не палова насельніцтва цэнтральнага рэгіёна працуе ў сельскай гаспадарцы і перапрацоўчай прамысловасці. І менавіта ад таго, як там ідуць справы, залежаць харчовая бяспека, дабрабыт жыхароў.

За апошнія гады Мінская вобласць дасягнула значных поспехаў як у эканамічнай, так і ў сацыяльнай сферы, раслінаводстве, жывёлагадоўлі. Міншчына па праве лічыцца жытніцай краіны. Яна штогод уносіць важкі ўклад у агульны каравай Беларусі. Аднак, як адзначалі ўдзельнікі дыялогавай пляцоўкі, дастаткова яшчэ і пытанняў, над якімі неабходна працаваць. У прыватнасці, над зніжэннем колькасці стратных гаспадарак, павышэннем узроўню заработнай платы, эфектыўнасці вытворчасці, над паляпшэннем дэмаграфічнай сітуацыі.

Старшыня Уздзенскага райвыканкама Сяргей САВІЦКІ і дырэктар саўгаса «Гарадок» Аляксандр ГРУША агучылі істотныя для гэтага рэгіёна праблемы замацавання маладых спецыялістаў, кваліфікаваных рабочых кадраў на сяле. Хвалююць удзельнікаў дыялогавай пляцоўкі і такія аспекты, як прыцягненне інвестыцый у сельскую мясцовасць, будаўніцтва жылля ў аграгарадках, населеных пунктах, дзяржаўная падтрымка сельскіх суб'ектаў гаспадарання. Падымаліся пытанні ролі і значнасці кіраўніцкіх рашэнняў, якія ўплываюць на эфектыўнасць эканомікі.

Усе агучаныя праблемы могуць быць улічаны пры падрыхтоўцы змяненняў у Канстытуцыю, падсумаваў вынікі абмеркавання **першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Сяргей ЛЯЎКОВІЧ.**

Падчас дыялогу жыхары Міншчыны не абыходзяць увагай і пытанні ўдасканальвання сістэмы мясцовага кіравання і самакіравання. У прыватнасці, скасавання Саветаў пярвічнага ўзроўню. На думку многіх, сельвыканкамы і дэпутаты сёння абмежаваныя ў фінансавых магчымасцях, каб дапамагаць людзям. Праўда, некаторыя сельсаветы зарабляюць за кошт сродкаў ад продажу зямельных участкаў, але ідуць яны не ў іх бюджэт. Некаторыя ўдзельнікі дыялогу за тое, каб тэрмін паўнамоцтваў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі працягнуць да пяці гадоў (цяпер чатыры гады), за пераход на змешаную прапарцыянальна-мажарытарную сістэму.

Дададзім, што актуальныя пытанні, у тым ліку і карэкціроўкі Канстытуцыі, абмяркоўваюцца і падчас правядзення грамадскіх прыёмных. Напрыклад, жыхары Дзяржынска прапанавалі скарэктаваць тэрміны перавыбрання дэпутатаў мясцовых, раённых, абласных Саветаў дэпутатаў. Выказаліся яны і наконт магчымасці ўвядзення выбарнасці старшынь судоў, дыферэнцыяцыі падыходаў да назначэння прафесійных пенсій, адмены платных адукацыйных паслуг, павышэння якасці аказання медыцынскай дапамогі.

Нагадаем, што самыя рацыянальныя прапановы па рашэнні актуальных праблем будуць абмяркоўвацца на Усебеларускім народным сходзе, які запланаваны на пачатак 2021 года.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Чабурашка загаворыць голасам Варум

Кінастудыя «Саюзмультфільм» рыхтуе аматарам Чабурашкі і Кракадзіла Гены падарунак да свят, якім стане навагодняя серыя знакамітага мультфільма «Чабурашка. Сакрэт свята», паведамляюць РІА «Навіны». Галоўных герояў у ім агучаць артысты Анжаліка Варум і Леанід Ярмольнік. Дакладная дата прэм'еры пакуль невядомая, але стваральнікі абяцаюць, што адбудзецца яна ў снежні.

Кароткаметражны мультфільм працягласцю шэсць хвілін будзе выкананы ў тэхніцы 3D. Песню для новай серыі напісаў спявак і кампазітар Леанід Агуцін. Як адзначылі на кінастудыі, «гэта будзе вельмі цёплы і ўтульны мультфільм аб шчырым сяброўстве і аб тым, як проста стварыць сабе сапраўдны цуд. Простая, лёгкая — гэтая кароткаметражная карціна дасць адчуванне свята як дзецям, так і іх бацькам». А выканаўца аднаго з галоўных герояў Леанід Ярмольнік падзяліўся, што яму было вельмі цікава і лёгка працаваць над вобразам: «Я веру і спадзяюся, што наступіла адраджэнне легендарнага «Саюзмультфільма». Таму адразу пагадзіўся і з задавальненнем агучыў любімага героя. Ужывацца ў ролю было нескладана, а як атрымалася — гэта ўжо судзіць гледачам».

Нагадаем, лялечны мультыплікацыйны фільм «Чабурашка» выйшаў на экраны ў 1971 годзе, але і да сёння застаецца адным з самых любімых у аўдыторыі як дзяцей, так і дарослых. Таксама раней агучвалі інфармацыю, што вядзецца работа над поўнаметражнай сямейнай камедыяй пад чарнавой назвай «Чабурашка», у якім плануюць паказаць вобраз любімага многімі пакаленнямі персанажа ў сучасным свеце. А нам пакуль застаецца чакаць абедзвюх прэм'ер.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 109

Сваю новую задачу прапануе наш чытач Сяргей Дарошчанка ***(гл. дыяграму)***.

Белыя: Крa5, Лe1, Лf1, Ch2, п. b6 (5).

Чорныя: Крa8, пп. b7, e2, f2 (4).

Мат за 2 хады.

Калі пераставіць белую ладдзю f1 на d1, а чорную пешку f2 — на d2, атрымаецца задача-блізня.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Наступная задача мінчаніна Чэслава Якубоўскага адзначана на міжнародным конкурсе «100 Tourney Maroc Echecs» другім пахвальным водгукам. Нагадаем, што ў задачах на кааператы ўны мат чорныя пачынаюць і дапамагаюць (!) белым паставіць ім, чорным, мат.

Белыя: Крa7, Лf7, Ce6, Cf8, п. a4 (5).

Чорныя: Крd4, Лe1, Kb7, Kf4, пп. d3, e2, g4, g5 (8).

Кааператыўны мат за 2 хады.

Рашае 1. Kd6 Л:f4+ 2. Крc5 Лc4x. Калі пераставіць пешку a4 на b2: 1. Kd5 Л:b7 2. Крc4 Лb4x. Калі тую ж белую пешку пераставіць на f2: 1. Крe4 Cc5 2. Kpf3 Cd5x.

* * *

У бліцтурніры на сайце chess.com (775 удзельнікаў) Кірыл Ступак заняў 8-е месца, Сяргей Жыгалка — 33-е.

Кірыл Ступак выйграў бліцтурнір, зладжаны анлайн Латвійскай федэрацыяй шахмат. Вось як ён перамог другога беларускага гросмайстра.

Кірыл Ступак — Аляксей Аляксандраў. 1. d4 Kf6 2. g3 d5 3. Cg2 c6 4. Kf3 Cf5 5. 0-0 h6 6. c4 e6 7. Kc3 Ce7 8. Фb3 Фb6 9. c5 Ф:b3 10. ab 0-0 11. b4 a6 12. Cf4 g5 13. Ce3 Kbd7 14. h4 g4 15. Kd2 Крg7 16. Kb3 Cd8 17. Cf4 Лe8 18. Cd6 h5 19. b5 cb 20. K:b5 Ke4 21. Cf4 Лc8 22. C:e4 de 23. Kd6 Cf6 24. K:b7 e5 25. de C:e5 26. Kd6 C:d6 27. cd Лb8 28. Kd4 Ce6 29. Л:a6 Л:b2 30. Лa7 Kf6 31. Ce5 Лd2 32. Лe7 Л:e7 33. de Cd7 34. Лb1 Крg6 35. Лb6 Лd1+ 36. Крg2 e3 37. Л:f6+, 1:0.

* * *

У адным з мінулых выпускаў мы згадвалі сёлетнія чэмпіянаты Брэсцкай вобласці, якія выйгралі 14-гадовая майстар ФІДЭ Аляксандра Тарасенка (сярод мужчын!) і кандыдат у майстры Аляксандра Шабан (сярод жанчын). Прапануем па адной іх пераможнай партыі.

Аляксей Грыгаровіч — Аляксандра Тарасенка. 1. e4 c5 2. c3 d5 3. ed Kf6 4. d4 cd 5. cd g6 6. Kc3 Cg7 7. Фb3 0-0 8. Ce2 Kbd7 9. Cf3 Kb6 10. Cg5 Cf5 11. Лd1 a5 12. a4 Лc8 13. Kge2 Лc4 14. 0-0 Лb4 15. Фa2 Cc2 16. Лc1 Cb3 17. Фb1 Kb:d5 18. Cd2 K:c3 19. bc Лb6 20. Фd3 C:a4 21. Лa1 Фd7 22. c4 Лc8 23. Лfb1 Л:b1+ 24. Ф:b1 Л:c4 25. Ф:b7 Ф:b7 26. C:b7 Лc2 27. C:a5 Л:e2 28. Л:a4 Kg4 29. Cf3 Лc2 30. h3 Лc1+, 0:1.

Алена Аль-Шэйх — Аляксандра Шабан. 1. e4 Kf6 2. e5 Kd5 3. Kf3 Kc6 4. d4 d6 5. Ce2 g6 6. 0-0 Cg7 7. ed cd 8. Cc4 Kb6 9. Cb5 0-0 10. C:c6 bc 11. Cf4 Kd5 12. Cg3 Cg4 13. c3 Лb8 14. b3 Фa5 15. h3 C:f3 16. Ф:f3 Л:b3 17. ab Ф:a1 18. Фe4 Cf6 19. c4 Kb4 20. d5 cd 21. cd Фd4 22. Ф:d4 C:d4 23. Лc1 K:d5 24. Ka3 Cb2 25. Лd1 C:a3 26. Л:d5 Cc5 27. Крh2 Лc8 28. f3 Cb6 29. Лd2 Лc1 30. Cf4 Лb1 31. Лd3 f6 32. Ce3 C:e3 33. Л:e3 Kpf7 34. f4 e5 35. fe fe 36. Лc3 Крe6 37. Лc7 Л:b3 38. Л:a7 h5 39. Лa5 Лd3 40. g4 hg 41. hg e4 42. Крg2 d5 43. Лa6+ Kpf7 44. Лa7+ Kpf6 45. Лa6+ Крg5 46. Kpf2 d4 47. Лe6 Лf3+ 48. Крg2 Лf4 49. Крh3 e3 50. Лe5+ Крf6 51. Лd5 Лe4, 0:1.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску (яе правільныя ўмовы — не на дыяграме, а ў запісе фігур ніжэй): 1. Ф:f2! Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

Каб зрабіць добрае кіно, патрэбен...

17 снежня традыцыйна будзе адзначацца Дзень беларускага кіно. А мы вырашылі расказаць, на што (у тым ліку і з гэтай нагоды) будзе цікава паглядзець у тэлеэфіры.

На канале «Беларусь 3» гледачоў чакаюць паказы кінастужак розных жанраў. Так, на працягу тыдня пакажуць дакументальныя фільмы Анатоля Алая «Чорны воран» і «Мяжу» Яўгена Сяцько, прыгодніцкую кінастужку «Вам — заданне» рэжысёра Юрыя Бяржыцкага.

А ў чацвер убачым фільм «Глыбокая плынь», які з'явіўся ў 2005 годзе, рэжысёра Івана Паўлава. Яго знялі па матывах раманаў беларускага пісьменніка Івана Шамякіна «Снежныя зімы» і «Глыбокая плынь».

...Вялікая Айчынная вайна ўскалыхнула ўсё мірнае насельніцтва беларускай зямлі. Праблема выстаяць, абараніць і вызваліць свой край ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў стала галоўнай і для тых, хто застаўся ў тыле ворага. У гэтых умовах Іван Антанюк, які раней узначальваў адзін з аддзелаў выканкама, становіцца камандзірам партызанскага атрада. У няспросты час яму давялося вучыцца прымаць правільнае рашэнне ў арганізацыі партызанскага руху, знаходзіць адзіны верны выхад у складаных перыпетыях ваенных падзей, а таксама спазнаваць горыч страт і зараджэнне глыбокага пачуцця кахання...

У драме зняліся шматлікія беларускія акцёры, сярод якіх Аляксандр Бяспалы («Кіроўца аўтобуса», «Белыя росы»), Уладзімір Грыцэўскі («Белыя росы», «Прыгоды Бураціна»), Алена Дуброўская («Брэсцкая крэпасць», «Каханне пад прыкрыццём») і іншыя.

Для тых жа, хто любіць даведацца штосьці новае пра кіно і глядзець на яго праз прызму аналізу, канал «Культура» прапануе ў пятніцу 18 снежня чарговы выпуск праграмы «Шэдэўры старога кіно». У ім згадаюць мастацкі фільм «Мядзведзь», які быў зняты на «Белдзяржкіно» ў 1938 годзе. У праграме прымуць удзел гісторык кіно Яўген Маргаліт і доктар мастацтвазнаўства Вольга Ягошына. А гледачы даведаюцца, чаму для актрысы Вольгі Андроўскай, выканаўцы галоўнай ролі, гэты фільм стаў першай работай на экране, на якую яна адважылася толькі пасля смерці яе мужа...

Дарэчы, рэжысёр кінастужкі Ісідор Ананскі неяк адзначаў, што супраць экранізацыі аднайменнай п'есы Антона Чэхава, якая і ўзятая тут за аснову, тады выступалі як кінематаграфісты, так і тэатральныя дзеячы. Аднак рэжысёр настаяў на сваім... Тая гісторыя расказвае нам пра памешчыцу Папову, якая глыбока смуткуе з прычыны смерці свайго мужа. Але нечакана да яе прыязджае крэдытор Смірноў. Паміж імі ўзнікае спрэчка, якая перарастае ў дуэль.

Сцэнарый рэжысёр пісаў пад канкрэтных герояў, да якіх пэўны час прыглядаўся. З Міхаілам Жаравым яны некалі працавалі разам у тэатры, але былі мала знаёмыя. Аднак гэта не перашкодзіла маладому рэжысёру прыехаць да акцёра дадому і атрымаць ад яго згоду іграць у карціне пасля прачытання яму сцэнарыя будучага кінафільма. Угаворваць давялося і Вольгу Андроўскую, якая да кінадэбюта была вядомая гледачам толькі па ролях у тэатры.

Падчас здымак рэжысёр выкарыстоўваў нязвыклыя для кіно таго часу доўгія панарамы, а таксама адмовіўся ад традыцыйнага мантажу. І з дапамогай мантажнай тэхнікі паралельнай дзеі ён спрабаваў узмацніць трывогу за ход дуэлі і зрабіць фінал больш нечаканым. Потым крытыкі адзначылі, што «Мядзведзь» быў найбольш цікавай экранізацыяй Чэхава даваенных часоў, «таленавіта і тэмпераментна разыграным жартам, у якім рэжысёр змог захаваць своеасаблівасць чэхаўскіх інтанацый». А Аненскі пасля ў сваіх мемуарах пісаў, што першымі гледачамі яго фільма былі Вольга Кніпер-Чэхава і Марыя Чэхава, якія падчас прагляду смяяліся да слёз, а пасля ўдава пісьменніка адзначала: «Стары вадэвіль зноў загучаў на экране свежа і пераканаўча».

Алена ДРАПКО.

«Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 студзеня 2021 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 15 студзеня 2021 года будуць разыграны 7 жаночых камізэлек і суперпрыз — маслены радыятар General Climate. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 студзеня 2021 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2021 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» чытайце ў нумары 230 газеты «Звязда» ад 25 лістапада.

Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.
Тэрмін правядзення гульні — з 01.12.2020 да 31.03.2021 года.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3885 ад 11.11.2020 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на I квартал або I паўгоддзе 2021 года

Хатні адрас і тэлефон _____
(абавязкова) *(індэкс)*

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.15 Навіны надвор'я.
10.40, 18.35 Меладрама «Натваім баку». 1-я серыя (16+).
12.10, 19.20 Меладрама «Натваім баку». 2-я серыя (16+).
13.05, 15.25 Меладрама «Віражы лёсу» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 0.15 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
21.55 Серыял «След» (16+).
23.55 Арэна.
0.35 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 19.35 Тэлебарометр.
9.05 «Панаехалі» (16+).
10.15 Камень, нажніцы, папера (16+).
10.50 «На тыдзень» (16+).
11.40 «Супержонка» (16+).
12.45 Прыгоды «Першы мсціавец: супрацьстаянне» (16+).
15.10 Анімацыйны фільм «Рататуй» (0+).
17.00 М/с «Стыч!» (6+)
17.45 «Мяняю жонку» (16+).
20.05 «Сямейныя гісторыі» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.15 «Тата папаў» (16+).
23.10 Хачу ў тэлевізар!
23.15 Серыял «Анатомія страсці» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Пражонка.
8.05, 12.00, 20.20, 23.30 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20, 18.50 «Без права на памылку». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.45 «Кадры жыцця». Оперная спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Людміла Колас.
11.35 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
12.50 «Наперад у мінулае».
13.20 «Навукаманія» (6+).
13.50, 21.40 «Арлова і Аляксандраў». Маст. фільм (16+).
15.40 «Дзеці Дон Кіхота». Маст. фільм (12+) [СЦ].
16.55 Канцэрт ВІА «Поющие гитары». «Нет тебя прекрасней».
18.10 «Люблю і помню». Рэжысёр, народны артыст Беларусі Барыс Луцэнка.
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Апошні дзень». Мікалай Рыбнікаў (12+).

Беларусь 5

7.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі.
8.50 Вынікі тыдня.
9.35 Біятлон. Кубак свету. Хохфільцэн. Эстафета. Мужчыны.
10.50 Вялікі спорт.
11.35 Хакей. КХЛ. «Куньлунь РС» (Пекін) — «Дынама-Мінск».
13.30 Піт-стоп.
14.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Жараб'ёўка.
14.30 Гульні «на выраст».
15.00 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Жараб'ёўка.
15.30, 22.20 Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
17.05 Біятлон. Кубак свету. Хохфільцэн. Гонка праследу. Жанчыны.
17.50 Бокс. Міжнародны турнір.
19.30, 22.10 Спорт-цэнтр.
19.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
20.40 На грані фолу. Футбольны агляд.
0.05 Аўтаспорт. Экстрым Е. Відэачасопіс.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.00** Нашы навіны.
9.15 «Контуры».
10.05 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.15 «Грамадзянская абарона» (16+).
13.15, 23.10 Серыял «Як звесці палюбоўніцу за 7 дзён» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 Серыял «Скажы што-небудзь добрае» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.15 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.05 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.30, 20.30 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.20, 16.50 «Арэлі». Серыял (16+).
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Міншчына».
22.05 «Глядзець усім!» (16+)
23.55 «Загадкі чалавецтва» (16+).
0.45 «Мінтранс» (16+).
1.30 «Самая карысная праграма» (16+).

МІР

5.00 Маст. фільм «Вялікая перамена» [СЦ] (0+).
6.20, 10.10 Серыял «Метад Фрэйда» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 17.15 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 «Міравое пагадненне» (16+).
18.15, 19.25 Серыял «Чужы раён-2» [СЦ] (16+).
21.40 «Гульня ў кіно» (12+).
22.25 «Назад у будучыню» (16+).
23.25 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
0.15 Серыял «Жураў» [СЦ] (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35 «Спецыяльны рэпартаж».
13.00 «У людзях».
13.35 «Плюс-мінус».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны—Беларусь.
14.40 Серыял «Марозава» (12+).
17.15 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Таямніцы следства-20» (16+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.10 Формы жыцця (6+).
6.25 Беларусы (6+).
7.05 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.25 Зламаць стэрэатыпы (12+).
8.45, 10.20, 11.00 Дэтэктыў «Пацалунак Сакрата» (16+).
13.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.50 Баявік «Марскія д'яблы. Рубяжы Радзімы» (16+).
14.55 «Чакай мяне» (12+).
16.20, 19.35, 22.25, 23.20 Сёння. Галоўнае.
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
17.00 «ДНК» (16+).
18.10, 19.50 Серыял «Пёс» (16+).
21.20 Серыял «Першы адзел» (16+).
22.30 «НЗ.by».
22.50, 23.35 Серыял «Груз» (16+).
0.05 Справа ўрачоў (16+).

8 канал

7.00, 16.15, 18.25, 21.05, 0.55 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 16.25 «Мультпарад» (6+).
7.30, 16.20, 20.50 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Звышнатуральнае» (12+).
8.20 Баявік «Голдфінгер» (12+).
10.10 М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк» (0+).
11.35, 16.55 Серыял «Сямейная сага» (16+).
13.05 Трылер «Фантастычныя стварэнні і дзе яны пражываюць» (12+).
15.20, 18.30 Серыял «Каралеўства» (16+).
19.15 «Суперлато».
19.50 Серыял «Торгсін» (16+).
21.10 Драма «Гатэль Мумбаі. Супрацьстаянне» (18+).
23.15 Трылер «Парадокс Кловерфілда» (16+).

ВТБ

6.05 «Лаві момант» (16+).
7.35 «Раніца з гумарам» (16+).
9.25 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
10.00 «Дзіцячы КВЗ» (6+).
11.00 «Рускія не смяюцца» (16+).
12.05 «Наш рамонт» (16+).
Акцыя праходзіць да 30 снежня з 15.00—18.00 штодня акрамя выхадных і святочных дзён. Па яе выніках каля 50 хлопчыкаў і дзяўчынак з трох цэнтраў карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Магілёўскай вобласці адрасна атрымаюць навагоднія падарункі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 10 снежня 2020 года.**

На мяжы маралі і права

І СНІД — у падарунак

Чаму некаторыя суайчыннікі свядома разносяць небяспечную інфекцыю, і як з гэтым змагацца

Такія паведамленні ў крымінальных зводках, на жаль, не рэдкасць. І на вялікі жаль, не чутно, каб колькасць іх памяншалася. Вось і нядаўна ў дачыненні да 31-гадовай брастаўчанкі было заведзена аж... 12 крымінальных спраў за тое, што заражала альбо падвяргала небяспецы заражэння СНІДам людзей, якія ні аб чым не падазравалі.

РАСТАПТАНАЕ КАХАННЕ

І напачатку адна гісторыя. Пра Наталлю я пісала даўно. Яна тады доўга не давала згоды на сустрэчу, а потым нечакана пагадзілася. Відаць, яшчэ і для таго, каб з некім пагаварыць. Цяжка было насіць гора і адчай у сабе 19-гадовай жанчыне. Мы сустрэліся ў парку, дзе яна гуляла з каляскай. Яе дачушка выглядала нібы анёлачак — ва ўсім белым. Мама таксама нагадвала мадэль — скураная куртачка ў тон каляскі, а туфлі аднаго колеру з манікюрам. Сама амаль дзіця яшчэ, а перажыла столькі, што справіцца з гэтым, неяк «раскласці па паліцах» не ўдавалася. Прынамсі, такое тады складвалася ўражанне.

Вось яе гісторыя, вельмі сцісла. Ён быў яе першым сапраўдным каханнем. Яна — юная летуценніца, толькі што скончыла школу, марыла аб прыгожым дарослым жыцці. А ён нібыта прыйшоў з мары: 30-гадовы, самастойны, упэўнены. Нават імёны ў іх — Наташа і Андрэй — нагадвалі ёй «Вайну і мір». О, якая яна была шчаслівая, мабыць, і Наташа Растова пазайздросціла б! І калі даволі хутка пасля знаёмства яе рыцар прапанаваў руку і сэрца, вядома ж, згадзілася. Праўда, маці казала ёй, што шлюбную сукенку надзяваюць на дзень, а кухонны фартух — на ўсё жыццё, маўляў, ранавата табе. Але ж дачка не прыслухалася да мамінай парады.

Потым пачала ўспамінаць і супастаўляць, як упаў пярсцёнак, як, едучы ў загс, убачылі (праўда, далекавата) пахавальную працэсію. Тады ж яна толькі смяялася, ніколі не верыла ў прымхі. А вось муж пры гэтым нібы спахмурнеў... Пасля вяселля жылі, як ёй падавалася, душа ў душу. Праз нейкі час паведаміла мужу прыемную навіну. На тое, што каханы не вельмі абрадаваўся, палічыла за лепшае не звяртаць увагі. На ўлік у жаночую кансультацыю стала своечасова. Там правялі ўсе неабходныя даследаванні.

Словы доктара: «У вас ВІЧ/СНІД» прагучалі як гром сярод яснага неба. Аналіз паўтарылі, але вынік быў ранейшы. Аказалася, што муж даўно ведаў пра хваробу, стаяў на ўліку, даваў падпіску, што праінфармаваны аб адказнасці за распаўсюджанне інфекцыі.

Падчас цяжарнасці яна прайшла курс лячэння. Урачы сказалі ёй, што своечасовая прафілактыка змяншае рызыку хваробы дзіцяці ў разы. Але малой было ўсяго тры месяцы, і канчатковы вердыкт пра яе статус яшчэ не быў вынесены.

А я пасля сустрэчы была ў шоку ведаеце ад чаго? Пра сам факт ведала раней, напрошваючыся на размову. Мяне здзівіла яе рэакцыя на ўчынак мужа. Яна сама, дарэчы, казала, што на яе месцы амерыканка альбо еўрапейка падала б у суд, абняславіла і пракляла мужа. А яна змірылася і стала жыць у сваёй сям'і так, каб ні суседзі, ні знаёмыя нічога не заўважылі... Нібы чакала, што можа як-небудзь само ўсё пройдзе, нібы кашмарны сон развеецца.

ВАР'ЯЦТВА ЦІ ПОМСТА?

Не ведаю, як далей склаўся іх лёс. Але з пункту гледжання маралі ўчынак мужчыны нават з цяжкасцю паддаецца кваліфікацыі. Адна справа, калі гэтыя безгаловыя дзеўкі «няцяжкіх» паводзін распаўсюджваюць інфекцыю сярод незнаёмых людзей, і зусім іншая, калі юнай прыгожай жонцы, якая бясконца давярае, паднесці хваробу, так бы мовіць, у якасці вясельнага падарунка. Можа, такая вось вытанчаная помста чалавецтву за сваё няшчасце, а можа, з галавой не ўсё ў парадку альбо тое і другое разам. Калі з чалавечых пазіцый можна разважаць і шукаць прычыны такога ўчынку, то закон мае цалкам канкрэтныя трактоўкі. Напрыклад, арт. 29 закона «Аб ахове здароўя» ўстанаўлівае, што пацыенты, у адносінах якіх атрыманыя звесткі пра наяўнасць у іх венерычных захворванняў альбо віруса імунадэфіцыту чалавека, у пісьмовай форме папярэджваюцца ўстановамі аховы здароўя пра наяўнасць захворванняў і неабходнасць захавання мер перасцярогі па іх нераспаўсюджванні. Акрамя таго, яны нясуць адказнасць за заражэнне іншага чалавека альбо за свядомае пастаўленне ў небяспеку заражэння.

СПРАВА І СУД

А ўжо за свядомыя дзеянні наступае крымінальная адказнасць. Як і ў выпадку з брастаўчанкай, якую прыцягнулі да адказнасці ў сёлетнім снежні. Яшчэ ва ўзросце 24 гадоў яна была праінфармаваная, што мае ВІЧ-станоўчы статус і папярэджаная аб крымінальнай адказнасці і аб забароне на палавыя кантакты без выкарыстання прэзерватываў. Але ўсе гэтыя патрабаванні маладая кабета ігнаравала. А жыла пры гэтым, як высветлілася, напоўніцу. Тымі, хто пацярпеў ад яе дзеянняў, прызнаныя 14 чалавек. Чацвярым пры гэтым яна перадала інфекцыю, а 10 паставіла пад небяспеку заражэння. І гэта выяўленыя пацярпелыя, але ж ніхто не дасць гарантыю, што ёсць іншыя, пакуль не выяўленыя. Вось так і распаўсюджваецца хвароба, якую празвалі чумой мінулага стагоддзя.

Вядома, у гэтым выпадку канчатковую ацэнку дзеянням фігуранткі дасць суд. І можна дапусціць, што жанчыне свеціць немалы тэрмін пазбаўлення волі. А летась у Лунінецкім раёне была асуджаная 34-гадовая грамадзянка за аналагічнае злачынства. Яна, як і жыхарка Брэста, сем гадоў таму была папярэджаная аб наступствах такіх вось сваіх паводзін. Але не адмовілася ад неабароненых зносін з мужчынамі. Ну і, вядома, не папярэджвала партнёраў аб сваім дыягназе. Пазней лабараторныя даследаванні пацвердзілі ў траіх пацярпелых станоўчы ВІЧ-статус. Усе пацярпелыя — мужчыны ва ўзросце ад 30 гадоў і старэйшыя. Па рашэнні суда жанчына пазбаўленая волі на дзесяць з паловай гадоў.

Цяжка сказаць, чым кіруюцца гэтыя людзі. Можа, усё той жа помстай: мяне заразілі, дык і я буду перадаваць далей. Альбо яны наогул не ўмеюць думаць з прычыны нізкага інтэлекту і сваёй асацыяльнасці. Ды ўсе гэтыя сумныя факты яшчэ раз сведчаць пра тое, што СНІД цыркулюе, небяспека цалкам рэальная і ні ў якім разе нельга страчваць пільнасць.

Загадчыца кабінета кансультацыйна-дыспансернага аддзялення па ВІЧ-інфекцыі Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы Ілона ПІНЬКЕВІЧ адзначыла, што з выяўленых з пачатку года ВІЧ-станоўчых пацыентаў амаль 85 працэнтаў атрымала вірус пры палавых кантактах. «Так што мараль па-ранейшаму мае значэнне для грамадства ў цэлым і кожнага чалавека ў прыватнасці. Бо заразіцца пры выпадковых сувязях можна не толькі ВІЧ, але і фактычна любой інфекцыяй, якая перадаецца палавым шляхам» — гаворыць урач-інфекцыяніст.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Будзь у курсе

Навагодні кірмаш 1945 года

Цікавы дакумент апублікаваў у сваім тэлеграм-канале старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК. Гэта рашэнне Брэсцкага гарсавета аб правядзенні навагодняга кірмашу ў першы пасляваенны год.

Рашэннем прадугледжана арганізаваць святочны гандаль харчовымі і прамысловымі таварамі ў перыяд з 27 снежня да 2 студзеня. Загадчыку гарадскога гандлёвага аддзела Шчапакіну прадпісвалася пусціць у продаж усе прамысловыя і харчовыя тавары, якія былі на складах «звыш фондаў». А дырэктару рынка т. Касусе давалі ўсяго тры дні на тое, каб адрамантаваць і прывесці ў парадак гандлёвыя сталы. Начальніку ж абласной міліцыі належала «павялічыць міліцэйскі нагляд» на рынках, каб забяспечыць парадак.

Яшчэ гарадскі Савет запатрабаваў палепшыць гандлёвае перадсвяточнае абслугоўваннне ва ўсіх гандлёвых пунктах горада.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«Гранд-атэль» па-полацку

У гістарычным цэнтры найстарэйшага горада краіны налета адкрыецца атэль, які працаваў тут яшчэ ў пазамінулым стагоддзі.

Адраджэннем займаецца прыватная фірма, якая вядзе рамонтныя работы ў былых інтэрнаце і вучэбным корпусе хіміка-тэхналагічнага каледжа. Будынкі агульнай плошчай больш за тысячу квадратных метраў былі прададзены на аўкцыёне. Пра гэта паведаміў на сваёй старонцы ў Instagram Ігар Марковіч, старшыня Полацкага раённага выканаўчага камітэта.

Нядаўна кіраўнікі мясцовай улады пабывалі на аб'екце, каб на месцы азнаёміцца з тым, што зроблена больш чым за год. Яны ўпэўніліся, што інвестары стараюцца максімальна захаваць першапачатковы выгляд гістарычнай забудовы, улічваючы архітэктурную каштоўнасць дэкаратыўнага афармлення фасадаў, саміх сцен.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Карысны досвед

Вываз адходаў толькі кантэйнерамі

Як павысіць эфектыўнасць збору і зрабіць больш танным працэс утылізацыі камунальных адходаў з мэтай іх наступнага пераводу ў разрад карысных другасных матэрыяльных рэсурсаў?

Пытанне далёка не новае, але ад гэтага не менш складанае ў вырашэнні. І адпаведная работа вядзецца. Паўсюдна прапануюцца і выкарыстоўваюцца розныя новыя падыходы. Напрыклад, мы ўжо неаднойчы расказвалі пра такі вопыт мясцовай улады ў розных рэгіёнах краіны, у тым ліку і ў сталіцы. Дарэчы, старшыня Мінскага гарадскога Савета Андрэй Бугроў неаднойчы акцэнтаваў увагу карэспандэнтаў «МС» на пастаяннай рабоце яго калег дэпутатаў па пошуку аптымальных варыянтаў збору камунальных адходаў.

Цяпер — новы крок у гэтай справе. У Мінску жыхарам прыватнага сектара (а ён немалы) бясплатна выдаюць індывідуальныя кантэйнеры аб'ёмам 120 літраў для збору адходаў. Але пры ўмове: іх вываз у сектары індывідуальнай жылой забудовы будзе весціся толькі кантэйнерным спосабам. Такім чынам, як бачым, арганізаваны вываз адходаў па ўзаемнай згодзе як саміх жыхароў прыватнага сектара, так і адпаведных гарадскіх службаў.

Сёлета ў мінчан ужо каля 24 тысяч такіх кантэйнераў.

Але ёсць нюансы: атрымаць кантэйнер можна толькі да 25 снежня бягучага года. Пасля гэтай даты вывозіць адыходы, сабраныя ў іншыя ёмістасці, не будуць. А таму, каб атрымаць бясплатны кантэйнер, варта як мага хутчэй звярнуцца на прадпрыемства, якое спецыялізуецца на вывазе адходаў у канкрэтным раёне сталіцы.

Леанід ТУГАРЫН.

«Нельга паэту не баяцца рассечанай грудной клеткі і відовішча таго, як у сэрца лезуць пальцам...»

9 ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПРА ШПІТАЛІ І ДАКТАРОЎ

Сёння ўвага ўсяго свету прыцягнутая да тых, хто апынуўся на перадавой у змаганні з пандэміяй, — да медыкаў. Не выклікае сумнення, што іх подзвіг, неверагодныя цяжкасці, з якімі яны сутыкнуліся, напружанасць нашых дзён адлюстроўвацца ў літаратуры. Іначай — што ж яна за «люстэрка часу»?
Але пра медыкаў пісалі і раней — рабілі іх героямі твораў, а шпіталі — месцам дзеяння. Тут ужо ўсё залежала ад задумы аўтара — трагедыя адбудзецца ў такіх умовах альбо фарс, рамантычная гісторыя альбо антыўтопія.
Сацыёлаг Артур Франк сцвярджаў, што калі пісьменнік піша пра хваробу, гэта «падсвядомы пошук вылячэння». Але ў гісторыі нашай літаратуры былі і пісьменнікі — прафесійныя дактары. Успомніць хоць б Францыска Скарыну і верш Максіма Багдановіча, які апісвае прыгатаванне першадрукаром лекаў для хворага пана пісара земскага... Саламея Русецкая-Пільштынова, лекарка XVIII стагоддзя, пакінула дзівосныя мемуары пра тое, як лячыла і жонак турэцкага султана ў Стамбуле, і нясвіжскіх Радзівілаў, і расійскую імператрыцу. Алаіза Пашкевіч-Цётка працавала фельчарам, вядомы драматург Анатоль Дзялендзік, аўтар «Анастасіі Слуцкай», — урачом-псіхіятрам у Рэспубліканскай псіханеўралагічнай бальніцы. Урэшце, паміж прафесіяй літаратара і доктара шмат агульнага: жаданне ратаваць, выпраўляць заганы, хоць і сказаў Салжаніцын: «Мы не ўрачы, мы — боль».
Давайце ж успомнім, пра якія бальніцы пісалі ў класічнай беларускай літаратуры.

1. Уладзімір Караткевіч «Нельга забыць»

«Палата была на трэцім паверсе. Верхавіны паркавых дрэў молада і сонечна глядзелі ў акно. Парк цягнуўся далёка-далёка, фортачка была круглыя суткі адчынена, і таму паветра ў палаце было прыемным і свежым».

Так апісваецца бальніца ў рамане «Нельга забыць» сёлетняга юбіляра, Уладзіміра Караткевіча. Там спрабуюць выратаваць ад сардэчнай хваробы каханую героя, Ірыну Гораву. Аўтар дае каларытныя партрэты медыкаў, у тым ліку старога кардыёхірурга Глінскага, суровага знешне, але вельмі чулага. Хірург ведае, што аперацыя будзе вельмі складаная, і спачувае каханню, у якога, магчыма, няма будучага.

«Глінскі пасуровеў.

— Ды пацалуйцеся ж вы, — сказаў ён. — Пацалуйцеся вы, урэшце. Як маленькія, не разумеюць усёй карысці... Некалькі дзён ёй нельга будзе... Ну!»

Караткевіч не абышоўся без заўсёднага гумару, трохі сабе чорнага. Адзін з маладых медыкаў так прамаўляе да паэта Грыневіча, які хвалюецца за сваю Ірыну:

«Нельга паэту не баяцца рассечанай грудной клеткі і відовішча таго, як у сэрца лезуць пальцам... Паэты дагэтуль уяўляюць сэрца ў выглядзе рэпы. Тая рэпа пахне, як кветнік, і напханая аж да самага нельга каханнем, уразлівымі ўздыханнямі і альбомнымі вершамі».

Аперацыя праходзіць удала. Але ўскладненне — і Ірына ўсё-ткі паміраe. Ёсць цікавая версія з'яўлення такой развязкі... Прататыпам гераіні была выкладчыца Караткевіча на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве, мастацтвазнаўца Ніна Молева. Каханне да яе было пакутлівае, Караткевіч расчараваўся ў сваёй абранніцы і нібыта вырашыў так вось сублімавацца, забіўшы ейнае віртуальнае ўвасабленне.

2. Іван Шамякін «Сэрца на далоні»

Зразумела, нельга абысціся без самага «медыцынскага» рамана беларускай літаратуры — «Сэрца на далоні» Івана Шамякіна. Гэткі вытворчы раман, які «адбываецца» ў дэкарацыях бальніцы, у асяроддзі кардыёхірургаў. Толькі ў адрозненне ад Караткевіча Шамякін не лічыў, што пісьменніка спалохае відовішча таго, як «у сэрца лезуць пальцам». Ён, наадварот, старанна збіраў матэрыял, назіраў і за аперацыямі... Галоўны герой — Антон Яраш, геніяльны хірург: *«Выгляд яго суровы і велічны ў асляпляльна белым каўпаку і ў жаўтаватым халаце», «сэрца, жывое, трапяткое, на шырокай добрай далоні... На вялікай, умелай, чулай, ласкавай далоні Яраша».*

Яраш працуе ў гарадской бальніцы № 3. Ён любіць сваю работу, але да будынка часам не ідзе, а крадзецца — галоўны ўрач, жанчына, закаханая ў Яраша, не дае праходу, а жонка доктара хваравіта раўнівая. Але галоўны канфлікт рамана — вакол персанажа, які застаўся ў мінулым... доктара Савіча, мужнага падпольшчыка, што загінуў падчас вайны, быў абылганы фашыстамі і лічыцца здраднікам. Яраш, які асабіста ведаў Савіча, вылечыць ягоную дачку і зробіць усё, каб аднавіць добрае імя гераічнага доктара. У Савіча ёсць прататып — доктар Клумаў, чыё імя носіць вуліца, сквер і бальніца № 3 Мінска, так што ў рамане гэты нумар згаданы невыпадкова. А вось у вобразе Яраша Шамякін, па ягоным прызнанні, адлюстраваў рысы яшчэ аднаго падпольшчыка — Кабушкіна.



3. Пімен Панчанка. «Сэрца і крыж»

А вось герой верша Пімена Панчанкі, вясковы доктар, мог прымаць пацыентаў толькі ў беднай хаціне, не дужа падобнай на сучасны шпіталь.

Дарадчык, суддзя, павітуха,
Мужыцкі сівы кастапраў,
Ён ведаў душу кожнай хаты,
Сакрэты ўсіх кветак і траў.
Не быў прагавіты на срэбра
І жыў беднавата, дзівак.
Дзе іншы урваў бы чырвонец,
Ён браў сарамліва пятак.

Гэты доктар прыдумаў, як нават пасля сваёй смерці працягваць ратаваць людзей. Ён загадаў вяскоўцам пахаваць сябе на гары і паставіць на магіле высокі жалезны крыж. І пасля таго ў вёсцы спыніліся пажары, маланкі перасталі біць у дрэвы ды падпальваць саламяныя стрэхі. «Забабонныя» мужыкі верылі ў цуд, а насамрэч доктар «арганізаваў» звычайны громаадвод: маланкі білі ў крыж на ягонай магіле, *«бо мёртвае сэрца / Людзей, як жывое, любіла, / Агонь на сябе выклікала, / Маланкі ў магілу лавіла».*

Вось такі апошні кабінет доктара-альтруіста — узгорак з высокім жалезным крыжом-громаадводам!

4. Іван Мележ. «Апошняя аперацыя»

А вось у доктара Васіля Дзянісавіча Бацюні з апавядання Івана Мележа, які таксама прымае пацыентаў у вёсцы, ёсць сапраўдная амбулаторыя. Невялікі будынак, але з неабходным рыштункам. Прынамсі, калі на вёску сталі наступаць немцы і снарад цяжка параніў вясковую жанчыну, доктар узяўся рабіць ёй аперацыю. Праўда, з-за гэтага сам не змог у час уцячы, і гітлераўцы, якія ўварваліся ў вясковы шпіталь, забілі і пацыентку, і доктара, які адмовіўся яе кінуць...

Апавяданне было надрукавана ў 1943-м у газеце «Бугурусланская праўда». Невыпадковае месца і невыпадковая тэма. У 1942-м Мележ быў цяжка паранены на фронце пад Растовам. Яму збіраліся ўжо зрабіць ампутацыю, але адзін доктар змог выратаваць будучага класіка ад страты рукі, якая пасля напіша «Людзей на балоце».

5. Уладзімір Жылка. «На шпітальнай пасцелі...»

Паэт «маладнякоўскай» эпохі Уладзімір Жылка добра ведаў пра бальніцы... Бо хварэў на сухоты. У 1925 годзе ён нават запісаў: *«Смерць саўсім не страшыць, нават больш: яна жаданая госця. Пужае жах жыцця — жорсткі і няўломны, няўмольны. Я баюся пустаты і хаосу, а яны паўнаўладны... Ах! Як цяжка жыццё, які велізарны цяжар. Б'ешся ў ім, як муха ў павучэнні. І, мітусячыся, яшчэ больш заблытваешся...»*

У той час Жылка, які апынуўся на тэрыторыі Заходняй Беларусі, быў пасланы на навучанне ў Карлаў універсітэт у Прагу. А ў 1926-м Жылку запрасілі ў Савецкую Беларусь — на Акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускай арфаграфіі і азбукі. Жылка застаўся на Радзіме. У той год ён і напісаў верш-наследванне свайму сучасніку, чэшскаму паэту Іржы Волькеру, які ў 24 гады памёр ад сухотаў:

«На шпітальнай пасцелі праменні падуць,
А трывогу іх чую ў абвязах, тканіне...
Там сябры на змаганне за праўду ідуць,
На змаганне ідуць, і ніхто не запыне!
На шпітальнай пасцелі праменне гарыць,
Але смерць патыхае з закуткаў
напасцю...
О, чаму не магу ісці з вамі, сябры?!
Чаму мушу ўміраць, калі прагну упасці!»

Жылка быў арыштаваны ў 1930 годзе — хворы, з тэмпературай, а ў 1933-м памёр ва Уржуме, у ссылцы.

6. Максім Лужанін «Рэпартаж з рубцом на сэрцы»

Ёсць у беларускай літаратуры і вобраз амерыканскай бальніцы. Прычым спісаны з натуры. Паэт Максім Лужанін, адзін з ацалелых «маладнякоўцаў», зрабіў неблагую кар'еру і быў пасланы ў 1968 годзе ўдзельнічаць у рабоце XXIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. У якасці такіх вось «вясельных генералаў» там пабываў шмат хто з вядомых беларускіх пісьменнікаў. І раптам — інфаркт. Лужанін трапіў у амерыканскі шпіталь, дзе яго паставілі на ногі. Відаць, каб выправіць непрыемны казус, ён напісаў твор «Рэпартаж з рубцом на сэрцы», дзе апісаў рэаліі буржуазнай краіны вельмі змрочна.

«А зараз, мала таго, што трапіў у Амерыку, дык убіўся і ў амерыканскі шпіталь. Гэта сапраўды няволя. Не вырвешся, не вылузаешся! Але ў асобнай палаце — рай у параўнанні з тым, што назвалася «чысцец».

«Чыстцам» Лужанін назваў агульную палату, дзе яго паклалі пасля прыбыцця: *«Пяць начэй заснуць было немагчыма — стаяў гвалт, трашчаў тэлевізар, безупынна лахаюць сёстры».*

Палата, дзе апынуўся ўрэшце беларускі літаратурны дэлегат, была невялічкая, але там меўся нават тэлевізар. Які, праўда, ніхто з амерыканскай абслугі не мог наладзіць — бязрукія ж, не тое, што савецкія мужыкі. Шпіталь апісаны як «дзевяціпавярховая будыніна, спланаваная паўкругам». Пісьменнік нібыта чуе ўяўны лічыльнік — бо кожная хвіліна лячэння ў шпіталі аплочваецца.

«Калі ты — гара абмякшых мускулаў на страціўшых рухомасць касцях — ляжыш на разумным ложку, паслушным кожнаму руху пальца, над табой апякуюцца вымуштраваныя, як лялькі, сёстры, кожны найдрабнейшы рух у тваім стане перадаецца на вельмі чулы прыбор, а той адразу запісвае на стужку, пыхкае зялёнай ці чырвонай іскаркай на экранчыку, гасне і ўзнікае зноў, — тады ты ўжо не чалавек, а штосьці паддоследнае».

Карацей, у гэтай «краіне без усмешкі», робіць выснову аўтар, ратуе толькі томік Прышвіна.

7. Ядвігін Ш. «З бальнічнага жыцця»

«Змяркалася. Візглівы вецер, як бы з вялікае злосці, ірваў апошнія з дрэў кляновых крывава-жоўтыя лісты, круціў іх у паветры, кідаў аб мокрую брудную зямлю, ганяў з месца на месца, як адкрасаваўшае, нікому не патрэбнае, ні на што нягоднае смяццё, і, закруціўшы, як круціць вір на глыбіні, біў імі аб тоўстыя, жоўтыя сцены, аб вялікія памуцеўшыя шыбы высокіх акон гарадской бальніцы... І ліплі крывава-жоўтыя лісты да тоўстых сцен бальніцы, як бы падслухаць хацелі, што чутно за імі, і ліплі крывава-жоўтыя лісты да памуцеўшых шыб, як бы заглянуць хацелі...»

Апавяданне старэйшага сябра Янкі Купалы Антона Лявіцкага, які абраў сабе псеўданім Ядвігін Ш., на думку многіх мысляроў, добра перадае пэўныя рысы беларускага характару. На гэты раз мы трапляем у дарэвалюцыйны шпіталь для бедных. Пацыент № 17, гэткі тыповы мужык-беларус, памірае занадта марудна, і наглядчык, якому надакучыла чакаць, пакуль той вызваліць месца, запісвае: «Памёр у 9 гадзін вечара». Што ж, трэба дык трэба... *«Як увесь свой нядоўгі век быў паслухмяны Сымон, так і ў гадзіну свайго канання стаўся паслухмяным начальству: у дзевяць сканаў».*

8. Васіль Быкаў. «Мёртвым не баліць»

«Хата, дзе размясцілася санчасць, сустракае нас прыветлівым агеньчыкам у двух вокнах (трэцяе, выбітае, заткнута ахапкам саломы) і — песняй. Нехта ва ўсё сваё асіплае горла натужна крычыць пад не дужа суладны басавіты гул некалькіх струн гітары:

Шаланды, полные кефали,
В Одессу Костя привозил»

Так аповесць Васіля Быкава «Мёртвым не баліць» пераносіць нас у палявы шпіталь, дзе падчас наступлення немцаў спрабуюць ратаваць параненых стомленыя дактары і самаахвярная медсястра Каця.

«Знака або флажка на хаце ніякага няма. Па дварах таксама нельга пазнаць, што тут санітарная часць. Але, як казаў капітан, гэта трэцяя хата ад цэркаўкі, што зводдаль сціпла шарэе беленымі сценамі, і Каця спыняе коней».

У сціплай абстаноўцы вясковай хаты адбываюцца чалавечыя трагедыі... Нехта з раненых не дачакаецца дапамогі, памрэ... Палонны немец спрабуе давесці, што ён не кепскі... А «пільныя таварышы» ўсё шукаюць сярод параненых ворагаў і дэзерціраў... *«А мы тут — суцэльная канцэнтрацыя болю».*

9. Андрэй Федарэнка. «Ланцуг»

Пачатак аповесці сучаснага беларускага пісьменніка Андрэя Федарэнкі «Ланцуг» нагадвае стыль Ядвігіна Ш. — шпіталь, стыхія:

«Лета, каля дзесяці гадзін раніцы, а ў кабінеце хірурга 14-й Мінскай клінічнай бальніцы Стэльмаха гарэла святло — на дварэ з самай ночы сеяўся цёмны, халодны дождж...

Кабінет знаходзіўся на першым паверсе старога, з тоўстымі сценамі і маленькімі, нізкімі вокнамі будынка, таму добра было чутно, як вада патокам бяжыць па асфальтавай дарожцы і сцякае ў люк пад акном. Па шыбах паўзлі звілістыя кроплі, у адчыненую фортку з двара залятала халодная імжа, і, здавалася, нават старыя клёны ў бальнічным дворыку, на які глядзела адзінае акно кабінета, неяк пагорбіліся, апусцілі пад гэтай няспыннай макрэчай рукі-галіны і ўжо самі не вераць, што цяпер — самае лета, ліпень, стаміліся чакаць лагоднага сонца і сабраліся толькі жаўцець і пакрысе засынаць...»

Падзеі ў рамане «Ланцуг» нанізваюцца адна на адну, выпрабоўваючы сумленне герояў. Малады хірург Вінярскі крадзе грошы, якія старэйшы сябар, хірург Стэльмах, збіраў на замежную аперацыю для дачкі Мілы... Але Вінярскаму, як і Раскольнікаву, не ўдаецца скарыстацца здабытымі злачынствам грашыма. Стэльмах памірае, Вінярскі, п'яны і няшчасны ад пакут сумлення, аддае пакет з доларамі жаніху Мілы... А той, бязладны паэт, «дарунак» таксама не ўтрымлівае... І вандруюць праклятыя грошы з рук у рукі...

Спадзяюся, гэтыя фрагменты цудоўных твораў беларускай літаратуры зацікавілі вас, і вы захочаце прачытаць усё цалкам. А заадно яшчэ раз прамовіць словы ўдзячнасці нашым урачам.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

БРАТ ЗА БРАТА

Як спявалася некалі, «...Это было недавно, это было давно». Са мной у адным класе вучыліся два хлопчыкі-блізняты. На твар — як дзве кроплі вады — не адрозніць, па адзенні таксама. Аднакласнікі губляліся — не распазнавалі, настаўнікі блыталі... Толькі фізік ніколі не памыляўся: выкліча, бывала, Лёню, а ўстане Валодзя. Ён адразу ж: «Садзіся, я цябе не выклікаў... Хай брат адкажа...» Прычым — не толькі на ўроках.

Неяк раз старшакласнікі школы № 18 запрасілі нас на баль. Многія пайшлі, хіба што Лёня дома застаўся... А Валодзя — той быў, танцаваў, пазнаёміўся з прыгожай дзяўчынай і нават назначыў спатканне: прапанаваў у наступную нядзелю разам схадзіць у кіно, «Тарзана» паглядзець, потым — абмеркаваць.

Ну што сказаць: закружылася галава ў хлопца — зусім забыўся, што ў наступную нядзелю ў школе шахматны турнір, што ён гуляе...

Партыя блізілася да свайго завяршэння, калі да Валодзі дайшло: восьвось на прыпынку каля кінатэатра з'явіцца Ірына, а ён спазняецца...

У той самы час маці паслала Лёню хлеба купіць. Той пайшоў (у сям'і палкоўніка загады не абмяркоўвалі), ды каля прыпынку ўсё ж спыніўся, бо пачуў:

— Добры дзень!

Сумненняў не было: гэта прыгожая дзяўчына віталася з ім. Пытала:

— Ты білеты ў кіно купіў?

— Не... Я па хлеб іду, — буркнуў Лёня.

— Дык зараз жа «Тарзан» пачнецца.

— Я на яго ўчора схадзіў.

— Як?.. Без мяне?!

— А хто ты такая, каб з табой?

Ірыне ад такога нахабства аж мову адняло!

— Як не сорамна? — спытала праз паўзу і ледзь не з плачам. — Сам прапанаваў прыехаць... Эх ты, кавалер!

На гэтым слове дзяўчына адвесіла яму звонкую аплявуху, павярнулася і ўскочыла ў «падплыўшы» трамвай.

...Лёня ўсё яшчэ паціраў шчаку, на якой праступіла ярка-ружовая пляма, калі на прыпынак прыбег запыханы Валодзя.

— Ты дзяўчынку не бачыў тут? — спытаў у брата.

І той, усё зразумеўшы, сказаў:

— Знаеш што... У наступны раз папярэджвай сваіх дзяўчат, што нас з табой — двое, бо чужыя аплявухі мне зусім без патрэбы... Свае б пяражыць!

...Некалі, без наручных гадзіннікаў, без тэлефонаў (нават кватэрных!) гэта было вельмі складана.

Зоя Максімава,

г. Віцебск.

ЯК НЕ ДУБЧЫКАМ, ДЫК БІЗУНЧЫКАМ...

Гэта было позна ўвечары, аднак мае сямейнікі (жонка з дачкой, унукі) спаць яшчэ не паклаліся. Яны досыць весела бавілі час, хоць па дзіцячых галасах і адчувалася, што ўжо, здаецца, гатовыя: надурэліся, нагарцаваліся...

Спытаеце, дзе такое магчыма? Ну вядома ж, на лецішчы.

Там, за дзень напрацаваўшыся, я звычайна «здаюся» першы: па лесвіцы падымаюся на гарышча, дзе маю свае, асобныя «апартаменты» — з ложкам, сталом, з любімымі газетамі і кніжкамі. Варта нейкую з іх разгарнуць...

Тэлефонны званок быў такі нечаканы, што я аж падскочыў. Глянуў на мабільнік: нумар — незнаёмы, голас жаночы таксама — пытае нейкага Арцёма.

— Ён у лес пайшоў, — кажу першае, што прыйшло ў галаву. І, мусіць, памыляюся, бо жанчына (і, здаецца ж, цвярозая?) гулліва пытае:

— А ці далёка той лес?

У мяне да размоў ахвоты ніякай: кажу, што павінен:

— Вы памыліліся нумарам. Ды і наогул... Добрыя людзі спяць ужо. Вам бы пара таксама.

Ага... Яна ўзяла і мяне паслухала: пяць хвілін не прайшло — пазваніла зноў, сказала, што ў мяне прыгожы голас, што ноч сёння — проста цудоўная, што ў такую вось грэшна спаць, а тым больш аднаму (?!).

Я адключыў тэлефон, з гадзіну яшчэ спрабаваў чытаць, потым закрыў кніжку. На гадзінніку была поўнач.

Перад тым як заснуць, на ўсякі выпадак уключыў мабільнік і ледзь не «апёкся», бо ў той жа момант ён зноў зазвінеў: ужо знаёмы жаночы голас прапаноўваў... сустрэцца (?!).

«Ну што ж гэта, думаю, робіцца? Нейкі тэрарызм тэлефонны... Ці дрэнны Галівуд: на першым паверсе дачы — унукі па ложках, а на другім — нейкая шалахвостка да дзеда «клеіцца»! Ну нарываецца ж! Варта яе паслаць... І няёмка: жанчына, як быццам...

У апошняе імгненне словы для яе знайшліся. Ні з таго ні з сяго я ляпнуў:

— Высылаю нарад.

— Я ж вам адрас... — пачала гаварыць жанчына і тут жа змоўкла.

Трэба разумець, пераканалася, што трапіла не туды (ці якраз «туды»?).

...Так ці іначай, але больш званкоў не было. Значыць, знайшоў я патрэбныя словы? Дару.

Няхай не спатрэбяцца.

Іван Г.,

г. Мінск.

ЛАЗНЯ... БЛІЗКАЯ І ДАЛЁКАЯ

Саўгас «За мір» утварыўся ў канцы шасцідзясятых мінулага стагоддзя, наша вёска ні стуль ні ссюль стала цэнтральнай сядзібай... Праўда, спачатку — як бы авансам, бо з усёй так званай сацыялкі на яе тэрыторыі была саўгасная кантора (у старым панскім доме), школка-сямігодка ды цесная лазенька. У ваколіцах яшчэ крамкі заставаліся — маленькія, у здымных памяшканнях.

А гэта значыла, што патрэбным стала ўсё: новае жыллё, фермы, зернясховішчы, клуб, само сабой лазня...

У нашай вёсцы яе будавалі вялікай — на два аддзяленні. Разлічвалі, што ўся акруга будзе прыходзіць.

І як быццам не памыляліся: людзі хадзілі, праўда, позняй вясною, летам. А вось у халады — ужо не, бо памыцца, а потым на вецер-мароз ды яшчэ і ў дарогу — ну хіба здурнеўшы... Ці каб нейкую хваробу нажыць. Лазня павінна быць блізка.

Вырашылі, што саўгас матэрыялы выдзеліць, мужчыны самі ў сваіх вёсках пабудуюць. І ніхто ж нікога не падвёў: з'явіліся новыя лазні.

А ў нашай, яшчэ не старой, як на тое ліха, кацёл прагарэў...

Дык вось. Дзве тутэйшыя маладзіцы згаварыліся, што Эдзік, муж Алены, пабудзе з дзецьмі, а Коля, муж Соні, звозіць іх у суседнюю вёску.

Усё, здаецца, прадумалі і...

Жанчын у лазні сустрэлі ветліва — госці ўсё ж.

— На чым дабраліся? — у раздзявальні спытала Мікалаеўна.

— Ды на лятучцы, — хуценька сказала Соня і нырнула ў пару.

Для іх з Аленай там адразу ж знайшлося і месца для тазіка, і вада, і тэмы для размоў, бо тутэйшыя жанчыны ведалі, што адна з «прыезджых» працуе ў канторы, другая — у буфеце. Ды і мужы ў іх не апошнія людзі: Коля — саўгасны механік, Эдзік-ветэрынар...

Чысцюткія ды аблашчаныя ўвагай, гэтыя маладзіцы ўжо апраналіся, калі адна з іх уголас заўважыла:

— Слухай, Соня, а дзе Мікалаеўна? Яна ж не мылася?

— Не...

— А нашто тады раздзявалася?

Пагаварылі яны так, падумалі ды пабеглі да машыны. Утрох ушчаміліся ў кабіну, паехалі дамоў, як раптам наперадзе матнулася нейкая постаць і... «Ба-а-бах!»... Будка за спінамі аж скаланулася!

Коля галаву ў плечы і па газах.

— Што гэта было? — спужалася Соня.

— Ды нешта кінулі, — прызнала Лена. — І калі б, не дай бог па кабіне, па шкле... Нічога не скажаш — «цёпла» праводзілі... А сустрэлі ж — як людзі людзей.

Нічога не зразумеўшы, тройца вярнулася дамоў.

...А ў панядзелак пад канец рабочага дня ў буфет увалілася Мікалаеўна. Моўчкі дастала з сумкі бутэльку дарагога віна, каробку цукерак і перад Соняй як не грымнула на калені:

— Прабач, дзіцятка! Гэта ж я, старая дурніца, пачула, што вы на лятучцы прыехалі, і мяне — як токам ударыла, аж затрэсла ўсю... Мой жа Іван з той лятучкі днямі не вылазіць! Ведама, брыгадзір: то запчасткі трактарыстам трэба падвезці, то работу праверыць, то людзей даставіць... А тут, думаю, што — да маладзіц пацягнула? Будзе іх па лазнях вазіць?.. Ну якое ж мне мыццё пасля гэтага? Апранулася ды на вуліцу. Машыны там нідзе не відаць. Я вакол лазні кругам... Бачу — на задворках лятучка. Схаваўся, паразіт. Фары выключыў. Баіцца, значыць, каб міліцыя не злавіла. Ведама — без пуцёўкі. Хто ж яе выпіша, дзевак катаць...

Прыгледзелася — ён у кабіне сядзіць, адпачывае, галаву на руль паклаўшы... Ну, думаю, падрамі, я потым пакажу, як распусту разводзіць... Схапіла нейкі брусок і ў засаду. Прычакала вас, шпурнула сваю «гранату» — сагнала злосць... Бягу дамоў і думаю, што гэтага пацягаку нават на парог не пушчу! Хай на вуліцы калее, сабака!

А бліжэй да дома дайшла, — бачу, нашы вокны блакітам свецяцца, тэлевізар ідзе, Іванка мой на ўслончыку пры печцы сядзіць... І так мне яго, беднага, шкода стала! Гэта ж нацягаўся за дзень, натаміўся, змёрз, а тут яшчэ і жонкі дома няма... Яна вунь што ўдумала, вунь што зрабіла... Прабачце мне, дзеванькі! Я во міравую прынесла. Давайце па кроплі вып'ем, каб дурнога пра нашу вёску не думалі, каб лішняга не сказалі, каб людзі не смяяліся з майго Навумыча.

З яго — як быццам не выпадала, а вось з жонкі...

І парагаталі тады жанчыны, і выпілі, і заспявалі... Галасы ў іх — Алены, Соні і Мікалаеўны — былі вельмі прыгожыя! Так што хораша пасядзелі, без крыўдаў разышліся. Але ж лазню тую помняць да сёння.

Любоў Загорская,

г. Магілёў.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж: *шчыры дзякуй усім, хто паспрабаваў адказаць на пытанне, быць ці не быць у «Звяздзе» конкурсу на найлепшую праўдзівую гісторыю, і пры гэтым «адважыў» ну столькі камплімент аў...*

Прымаем. Як і вашы новыя творы.

Неасабісты суб'ектыў

Падмена паняццяў

Што бывае, калі катэгарычнасць становіцца памяркоўнасцю

ПРА сваю стрыечную сястру з Украіны я ўжо згадвала ў гэтай рубрыцы неаднойчы. Дае мая Наталля нагоду для разваг раз за разам. Хоць, здавалася б, у нас павінна быць больш агульнага, чым рознагалоссяў: мы амаль равесніцы, яна таксама з гуманітарнай сферы — выкладае ў каледжы, дый блізкая радня як-ніяк — у нас агульная бабуля і дзед — ветэран-ардэнаносец, гонар усёй сям'і. Але нешта ў нас апошнім часам не складваецца, асабліва, калі пачынаем гаварыць ці перапісвацца... не, не пра палітыку. Пра мінулую вайну.

Вось і гэтым разам. Нагледзелася Наталля паведамленняў у сеціве і пачала мне пісаць пра тое, што дарэмна ў нас на дзяржаўным узроўні асуджаюць калабарацыяністаў і ўсё, што з імі звязана. Маўляў, многія з гэтых людзей супрацоўнічалі з фашыстамі з самых высакародных меркаванняў, рупіліся пра нацыянальнае адраджэнне. Здзіўляцца гэтаму я асабліва не стала — у краіне, дзе ў герояў узвялі Бандэру і Шухевіча, дзе ветэраны вайны не могуць надзець узнагароды без рызыкі быць пабітымі, так разважаць, напэўна, не тое што модна — жыццёва неабходна. Бо інакш у той жа сістэме адукацыі ты наўрад ці будзеш доўга працаваць. Я ў яе толькі спыталася: «А тыя, хто разам з фашыстамі тысячамі расстрэльваў яўрэяў у Львове і Бабіным Яры, — таксама рупіліся пра нацыянальнае адраджэнне?» На што яна сумелася — цяпер там не прынята адказваць на падобныя пытанні — і выдала: «Заўсёды, нават у самай добрай справе, знаходзяцца дрэнныя людзі. А былі і тыя, хто свята верыў у свой народ, хто хацеў для яго лепшай долі, і мы не маем права іх асуджаць, бо ўсё тады было нашмат складаней, чым нам бачыцца сёння...» Я гнеўна напісала ў адказ, што наш з ёй дзед Васіль, які прайшоў у пяхотным палку ад Сталінграда да Берліна, пэўна, ужо не аднойчы перавярнуўся ў труне, і на тым дыялог скончыла...

АЛЕ застаўся душэўны дыскамфорт. Не, не ад таго, што фактычна пасварылася з блізкім чалавекам. Як пасварыліся — так і памірымся, на тое і радня. Не дае спакою іншае. Як дарослая жанчына з вышэйшай адукацыяй, маці дваіх дзяцей, выхаваная яшчэ ў савецкай сістэме, так лёгка памяняла перакананні? Што стала з памяццю, з розумам у чалавека, чый дзед ваяваў, чый бацька збіраў з малодшай сястрой гнілую бульбу на полі, каб пракарміцца пасля вайны? Чыю бабулю паліцаі ганялі пад аўтаматамі капаць магілу койданаўскім яўрэям? Што з ёй зрабілі такое, што яна, якая заўсёды першая віншавала з Днём Перамогі, ужо праз год пасля іхняга Майдана ў адказ на маё віншаванне адказала: «Для каго свята, а для каго — наадварот»? Які дваццаць пяты кадр уставілі ёй у мазгі, што яна пачала думаць так?

Ведаеце, да чаго я дадумалася? Уся справа вось у гэтым асцярожным: «мы там не былі, мы не маем права асуджаць, усё было нашмат складаней, чым здаецца...» Менавіта гэта памяркоўнасць, адсутнасць катэгарычнасці, той самай, якая была яшчэ ў нашых бацькоў, калі размова заходзіла пра злачынцаў і герояў той вайны, і робіць з розумам і светапоглядам нас, а тым больш нашых дзяцей страшнае. Таму што ад гэтай памяркоўнасці і ўсёдаравальнасці зусім невялікі крок да падмены паняццяў — і тады злачынцы становяцца героямі.

І ўжо позна казаць камусьці, што «ўсё было тады нашмат складаней, чым здаецца», — гэта не пра паліцаяў і не пра тых, хто ў акупаваным Мінску выдаваў газеткі і пісаў вершы пра «вольную Беларусь». Гэта пра герояў аповесцяў Быкава, калі маладзенькі салдат кідаецца на ўзброеных аўтаматамі фашыстаў са сцізорыкам, гэта пра Міная Шмырова, які ахвяраваў сваёй сям'ёй, гэта пра простых беларусаў, якія, рызыкуючы жыццём, хавалі ў сябе яўрэйскіх дзяцей... Тады ўжо позна тлумачыць камусьці, чаму ў некаторых беларускіх вёсках і сёння «легіён» — самая абразлівая мянушка (так звалі ў вайну «легіянераў»-паліцаяў). Нікому ўжо гэта не будзе цікава, бо «легіянеры» будуць ужо ў статусе герояў, бо «мы не маем права асуджаць, бо ўсё было нашмат складаней, чым здаецца...»?

Гэта не пра нас? Мы гэтага не дапусцім? Пачакайце заракацца. Я вам тут пару вершаў працытую. З адкрытых крыніц, як кажуць. «Радасць жаўранкам звоніць над хмарамі, // хай не згледжу яе, не збяру... // дні насталі важкія, змагарныя, // зноў спрабуе расці Беларусь»... «З кажным днём, можа, // з кажнаю справай // праўдзівей, праўдзівей зажывём... // Пералічым крыжы // і павернем // забываць, // будаваць // і тварыць, // новай праўды прарошчваць зерне // на папелішчы праўдаў старых!» «Гляньце! // Новым веснім цветам // дні прад намі расцвітаюць». «І чаму на гнуткіх і пявучых струнах // новых пуцявінаў, сцежак і дарог // не пайсці вось гэткім раннем цёмнарунным // рэзаць маршы жвавым, рэзвым смыкам ног»... Што не так з гэтымі патрыятычнымі і даволі таленавітымі вершамі? Месца і дата напісання. Мінск, 1942-43 гады. «Зноў спрабуе расці Беларусь...» Самы злосны выродлівы жарт. Нават калі дапусціць, што аўтару было невядома, што «новы рэжым» творыць па ўсёй Беларусі... Нібы не было ў тым жа Мінску шыбеніц, гета, аблаў, Трасцянца побач з горадам. Ці, «рупячыся аб нацыянальным адраджэнні», гэтага можна было не заўважаць?

Якое дачыненне ўсё напісанае мае да нас, сённяшніх? Аўтарка прыведзеных радкоў напісала ў 1943 годзе (на ўсякі выпадак нагадаю толькі адну дату і адно слова. 23 сакавіка 1943 года. Хатынь) верш «Малітва». Так-так, той самы «Магутны божа», які нядаўна памяркоўныя да гісторыі людзі ўмудрыліся заспяваць на мінскай «Яме» — месцы масавага расстрэлу яўрэяў...

НА гэтым варта паставіць шматкроп'е — няхай кожны дадумае сам. Мы ж пакуль не развучыліся думаць. Прынамсі, вельмі хочацца ў гэта верыць.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Речицкий завод «Термопласт» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Олейника П. С. извещает о проведении 28 декабря 2020 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
	Условия продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Лоты №№ 1, 2, 8 расположены на земельном участке с кадастровым номером **324550100001000008** площадью **2,3400 га** предоставлен **ОАО «Речицкий завод «Термопласт»** на праве постоянного пользования. Целевое назначение земельного участка: размещение промышленных объектов. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов) для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст.ст.19,45 «Кодекса Республики Беларусь о земле», установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки), через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений. **3.** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Чапаева, 57			
1	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285190** общей площадью **614,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание материального склада. Капитальное строение с инв. № 340/С-1847** общей площадью **580,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание. Ограничение (обременение):** договор аренды № 4 от 09.10.2019 г., сроком действия по 08.10.2020 г., площадь, сданная в аренду, – **44,9 кв. м.** Канализационная сеть – 160,0 м (инв. № 11). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 350,0 кв. м (инв. № 16). Забор железный с металлическими воротами – выделенная 1/6 часть ворот (инв. № 10). Система видеонаблюдения (инв. № 393)	**42 152,55**	2 107,63	4 215,26
2	**Капитальное строение с инв. № 340/С-299838** общей площадью **936,7 кв. м,** назначение – здание для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание цеха для размещения линий по переработке полимерсодержащих отходов и выпуску предизолированных труб.** Забор железобетонный – 138,15 м.п. (инв. № 14). Канализационная сеть – 220,0 м (инв. № 11). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 1 117,85 кв. м (инв. № 16). Экструзионная линия для производства PE-труб 75 с зоной дегазации и сменной сетки на трубы D 75,90,110,160,200,250 мм, ЛТМО – 90х30-75/160 (инв. № 385). Экструзионная линия производства напорных труб для газопроводов, многослойных труб, для отопления из полиэтилена D 50, 63, 75, 90, 110 мм. (инв. № 397). Линия экструзионная для производства PE-RT-трубы (5-слойной) с защитным кислородным слоем (инв. № 398). Принтер капелеструйный Willet-430 (инв. № 400-А). Забор железный с металлическими воротами – выделенная 1/6 часть ворот (инв. № 10)	**315 217,71**	15 760,89	31 521,77
8	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285198** общей площадью **457,0 кв. м,** назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание производства труб полиэтиленовых № 2.** Линия для производства труб 45-73 мм. ЛТМ-63х30 (инв. № 257). Забор железобетонный – 56,0 м. п. (инв. № 14). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 140 кв. м (инв. № 16). Забор железный с металлическими воротами – выделенная 1/6 часть ворот (инв. № 10)	**32 714,69**	1 635,73	3 271,47
9	Котел водогрейный КВ-400/95Т (инв. № 377), г. в. 2009, мощность 400 кВт. Котел водогрейный (инв. № 374), г. в. 2008	**2 730,00**	136,50	273,00
10	Теплотрасса (инв. № 12), г. в. 1984	**23 400,00**	1 170,00	2 340,00
11	Станок правильно-отрезной 1Д-162-01 (инв. № 331), г. в. 1992	**1 650,00**	82,50	165,00
12	Агломератор А02.00.00.000 (инв. № 358), г. в. 2004, мощность привода 15 кВт	**930,00**	46,50	93,00

Продавец: ОАО «Речицкий завод «Термопласт», ул. Чапаева, 57, 247500, Гомельская область, г. Речица. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 554-10-33 управляющий в деле о банкротстве – Олейник Павел Станиславович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

